Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

КРАСАВІК 15 1933 г. № 83 (4627)

Год выданьня XVI

ПА-БАЛЬШАВІЦКУ СУСТРЭЦЬ ТАРФЯНЫ СЭЗОН

Торфсэзон, як кажуць, на носу. Паводле пляну Белторфу і іншых сыстэм, торфаздабыча павінна распачацца 5 мая. Але сёлетняя вясна выперадзіла пляны тарфяных арганізацый. Балоты ўжо даўно ачысьціліся ад сьнегу, тарфяная маса вызваляецца ад скаваўшых яе зімовых марозаў і паступова прасыхае. Можна з упэўненасьцю разьлічваць, што масавая торфаздабыча разгорнецца ў апошніх лічбах красавіка.

З гэтага пункту гледжаньня трэба ацэньваць і нашу падрыхтаванасьць да сустрэчы тарфянога сэзону. Якое становішча мы маем на сёньняшні дзень? Яўна недавальняючае. Ні адна з сыстэм, здабываючых торф, да сэзону не гатова. Возьмем для прыкладу Белторф. Ён аб'яднае 10 самых буйнейшых, па сутнасьці рашаючых торфазаводаў — **Асінторф, «Бальшавік», «Шлях сацыялізму»** і інш. Аднак, ні адзін з іх поўнасьцю да сэзону яшчэ не падрыхтаваўся.

Асабліва адсталым вучасткам падрыхтоўкі зьяўляецца забесьпячэньне торфараспрацовак рабочай сілай. **Ва ўсёй сыстэме Белторфу не хапае больш 3 тыс. тарфяникоў і 2,5 тыс. тарфяніц.** Да агульнай патрэбнасьці, рабочых гэты недахоп складае больш паловы. На асобных-жа заводах процант забясьпечанасьці яшчэ ніжэйшы. **Так, Асінторф навербаваў толькі 48 проц. патрэбнай колькасьці рабочых, «Чырвоная Беларусь» — 47 проц., «Бальшавік» — 24, «Чырвоны сьцяг» — 18, «Свабода» — 9 проц.**

Становішча, можна сказаць, пагражаючае, але яно, як відаць, зусім не турбуе кіраўніцтва Белторфу і многіх торфазаводаў. Яны спакойна сядзяць у сваіх габінэтах і чакаюць, пакуль рабочыя прыдуць да іх самі, ў парадку самацёку. Вярбовачны апарат пры заводах хоць і арганізован, але ён у большасьці сваёй непрапазідольны. Урокі мінулых гадоў у гэтай частцы ня ўлічаны.

Ня гледзячы на неаднаразовыя ўказаньні з боку партыі і ўраду аб вылучэньні на пасады вярбоўшчыкаў лепшых ударнікаў-тарфянікаў, праверных непасрэдна на вытворчасьці, Белторф слаба ажыцьцяўляе гэтыя ўказаньні. Вярбоўшчыкі ў сваёй большасьці — выпадкова папаўшыя на торф заводы людзі. Яны толькі і здольны праехаць сельсавет, або калгас, атрымаць там паперку, што «лішкаў рабочай сілы ў калгасах няма» і з гэтым зьвярнуцца назад. Інакш кажучы, людзі выконваюць даручаную ім работу фармальна, па-казённаму. У раёнах вярбоўкі рабочай сілы ніякай масавай работы вакол торфаздабычы, як важнейшай галіны народнай гаспадаркі БССР, не праводзіцца. Нярэдкі выпадкі, калі вярбоўка калгасьнікаў праводзіцца без ведама праўленьняў калгасаў. Прыедзе ў вёску вярбоўшчык, пагаворыць з асобнымі калгасьнікамі, запішча іх у сьпіс завербаваных і лічыць, што ён сваю справу скончыў. А далей, хоць трава не расьці. Ці зьявяцца завербаваныя на работу ці не — для яго ўсёроўна.

Аб чым гэта сьведчыць? Перш за ўсё, аб недаацэнцы многімі кіраўнікамі торфараспрацовак усёй важнасьці пытаньня своячасовага і поўнага забесьпячэньня торфаздабычы рабочай сілай, аб перазуменьні таго **новага**, што зараз ёсьць у галіне адхоцтва. У пастанове ЦВК і СНК СССР ад 17 сакавіка 1933 году пра гэта ясна і дакладна сказана, што **«прадугледжа засеяць зямлю заводзкіх дапаможных гаспадарак, пашырыць сьвінаадкормачныя пункты, арганізаваць трусатнік.** Зразумела, што за ўсю гэту работу нясуць адказнасьць і самі гаспадарнікі заводаў. Іх просты абавязак — **ажазаць торфрабкопкам практычную дапамогу сіламі і сродкамі.**

Такавы задачы арганізацыі тарфяной прамысловасьці ў галіне клопатаў аб людзях — рашаючай сілы на торфараспрацоўках. Але клапаціцца трэба ня толькі аб людзях. Вялізарную ролю ў торфаздабычы адыгрывае яе мэханізацыя. Таму клопаты аб торфмашыне і трактары таксама маюць важнае значэньне. У чым заключаюцца гэтыя клопаты? Перш за ўсё ў тым, каб усе мэханізмы да пачатку торфаздабычы былі прыведзены ў баявую гатоўнасьць, своячасова і добраякасна адрамантаваны і ўстаноўлены на месцах непасрэднай работы.

«Зьвязда» ўжо пісала аб тым, што рамонт мэханізмаў на торфазаводах праходзіць вельмі марудна. Трактарны парк па сыстэме Белторфу адрамантаван толькі на 80 проц., торфамашыны — на 90 проц. далейшы рамонт фактычна спыніўся з-за адсутнасьці сталёвага ліцьця і запасных частак. Ня гледзячы на сыгналы «Зьвязды», Аўтарамонтаб па-ранейшаму не спяшаецца са снабжэньнем торфазаводаў запаснымі часткамі. Завод імя **Варашылава** таксама не зрабіў належнага зруху ў вырабе сталёвага ліцьця для 10 новых торфамашын, якія яму заказаны больш 3-х месяцаў таму назад. А кіраўнікі Белторфу спакойна канстатуюць: **«Усё, што маглі мы зрабілі, далейшае ад нас не залежыць».** Яны ня прымаюць рашучых мер праз апавешныя арганізацыі да канкретных зрыўшчыкаў праграмы торфаздабычы.

Тарфяная прамысловасьць БССР у сваім разьвіцьці мае вялізарныя посьпехі. За гады першай пяцігодкі значна пашырылася сетка заводаў, вырасла іх тэхнічная ўзброенасьць. Аднак, праграма торфаздабычы амаль штогодна парушаецца не выконваецца. Якія-ж прычыны такога становішча? Іх вельмі многа. Але асноўная — гэта слабая перабудова работы і ў першую чаргу кіраўніцтва, на аснове **гістарычных указаньняў тав. Сталіна.**

За апошнія гады ўмовы работы на торфараспрацоўках значна ўскладнілісь. Ускладнілася і само кіраўніцтва торфазаводамі. Мы ўжо маем справу не з маленькімі саматужнымі торфараспрацоўкамі, а з вялікімі мэханізаванымі торфазаводамі. Імі ўжо нельга кіраваць «наогул», седзячы ў канцылярыі. Трэба спусьціцца ўніз, непасрэдна на балоты, у кар'ер і ажыцьцяўляць там практычнае кіраўніцтва работамі.

Пастанова СНК СССР і ЦК УсеКП(б) аб рабоце вугальнай прамысловасьці Данбасу, якая недаўна была апублікавана ў друку, рашучым чынам выкрывае прычыны прарываў у выкананьні праграмы вугледабычы і вызначае практычныя мерапрыемствы па ліквідацыі адставаньня Данбасу. Гэтыя мерапрыемствы ў значнай ступені датычыць і тарфянай прамысловасьці. Таму задача Белторфу і іншых сыстэм — неадкладна ўзяцца за ажыцьцяўленьне пастановы ЦК і СНК.

Торфсэзон набліжаецца. Па-бальшавіцку падрыхтуемся да яго сустрэчы! Забясьпечым сацыялістычныя топкі добраякасным апалам!

Да ўсебеларускай драматургічнай нарады

Усебеларуская драматургічная нарада, якая скліканa на 15 красавіка Аргкамітэтам Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў Беларусі і Народным Камісарыятам Асьветы, мае сваёй мэтай прыцягнуць увагу ня толькі пісьменьнікаў-драматургаў, але і ўсёй савецкай грамадзкасьці да гэтага важнага вучастку культурнага фронту.

Пралетарыят, узяўшы ўладу адкрыта і беспадзельна, мае поўную магчымасьць сьвядома і арганізавана паставіць на службу тэй вялікай, сапраўды ўсечалавечай ідэі, якую ён нясе, усі мастацтва, і ў першую чаргу тэатр. Хто ня памятае, якую вялікую ролю адыгралі драматычныя гурткі ў Чырвонай арміі ў часе самых жорсткіх баёў на ўсіх франтох, якую ролю адыгралі драматычныя гурткі на прадпрыемствах і ў вёсках. Недарма нацдэмы і нацыяналістычная кулацкая частка вясковай інтэлігенцыі ў свой час імкнуліся пераварыць гэтыя гурткі ў сваю апору, у свой мастацкі і культурны фронт: яны разумелі, што нават праз такую прымітыўную форму тэатру нашы камсамольскія і партыйныя арганізацыі, органы народнай асьветы прапагандуюць з вялізарнейшым посьпехам ідэі, якія арганізуюць масы на барацьбу з клясавым ворагам.

Наша гаспадарка зьяўляецца пляновай гаспадаркай, кожны грам матар'ялу і кожную капейку патрэбна скарыстаць з максымальнай эфэктыўнасьцю як для далейшага росту вытворчасьці, так і для задаваленьня патрэб працоўных. Адначасова з гэтым, зараз ва ўсёй шырыні паўстае задача па шырокім перавыхаваньні ня толькі мільённых мас сяланства, але і значных пластоў рабочых. Зразумела, дасягнуць гэтага перавыхаваньня можна толькі ўсёй сыстэмай эканамічных і палітычных мерапрыемстваў.

Тэатр у гэтай сыстэме можа і павінен адыграць дапёка не апошнюю ролю, тым больш, калі мы і тут своечасова заторасуем нашу прыхільнасьць да пляновага і максымальна поўнага скарыстаньня ўсяго таго, што можа паскорыць наш рух наперад. Вось чаму мы

атру перад усёй нашай грамадзкасьцю, падняць яго на больш высокую ступень і дабіцца максымальнага эфэкту, патрэбнага для будаўніцтва сацыялізму.

Тэатральнае мастацтва — сынтэтычнае, складанае мастацтва, пачынаючы ад драматурга, рэжысэра, артыста, дырыжэра і канчаючы мастаком, які афарміць дэкарацыі і вопраткі, кожны ўносіць сваё у тэатральную пастаноўку, кожны ў поўнай меры — адзін у большай, другі ў меншай — зьяўляецца сваласаблівым суаўтарам пастаноўкі. Нярэдкі выпадкі, калі паміж гэтымі суаўтарамі ідзе разгалосьсе (хоць яно і не зафіксавана, а часта і ня выказана), якое выяўляецца пры паказе дысананс паміж замыслам аўтара, ідэяй яго п'есы, створанымі ім вобразамі і практычным раскрыцьцём гэтых вобразаў як з дапамогай ігры артыстаў, так і з дапамогай афарміленьня паказу. Нярэдкі таксама такія выпадкі, калі драматургічны матар'ял дапаўняецца апрацаваным, культурным, ідэалёгічна-падсаваным калектывам артыстаў і рэжысурый. І ўсё-ж усе суаўтары пастаноўкі працуюць вакол дакага ім асноўнага стрыжня, які ў вялізарнай ступені абумоўлівае ня толькі напрамак іх работы, але і яе межы. Такім стрыжнем зьяўляецца драматургічны матар'ял. Ён зьяўляецца вядучым у пастаноўцы, у тэатры. Доказ гэтага — рост нашых тэатраў на пастаноўках п'ес лепшых драматургаў («Гута» Кобэца, «Бацькаўшчына» К. Чорнага) і крок назад па пастаноўках слабых п'ес.

Знайсьці формы супрацоўніцтва тэатральнага калектыву, суаўтароў пастаноўкі і драматурга, як вядучага ў пастаноўцы, знайсьці агульную мову, сугучную ідэям аўтара — гэта задача стаіць перад нарадай, як адна з асноўных генэральных задач, бо ад вырашэньня яе залежыць якасьць і грамадзкая каштоўнасьць работы тэатру.

Абгаварэньне гэтых пытаньняў, творчых пытаньняў тэатральнага мастацтва — асноўная задача драматургічнай нарады. Таму пры абгаварэньні ўсіх кам-

зумела, найбольшая доля ўвагі, чаму і сін павінна быць накіравана на вядучы пачатак — драматургічны матар'ял. а абгаварэньне яго павінна быць усебаковым: і з боку тэматыкі, і з боку праблемнасьці, і з боку ідэалёгічнай сытуацыянасьці, і з боку мастацкасьці. Гэта нарада павінна дапамагчы тэатральнай крытыцы знайсьці тое асноўнае зьвяно, за якое трэба ўхапіцца драматургу, каб стаць на ступень вышэй у сваёй творчасьці. Пры абгаварэньні канкретных пастановак, нарада павінна ўскрыць уплывы буржуазнай ідэалёгіі, а часамі нацыяналістычную кантрабанду як у драматургічным матар'яле, так і ў афарміленьні яго тэатрам, каб на гэтым заваротным рэвалюцыйную пільнасьць усіх работнікаў тэатральнага фронту і ачысьціць наш савецкі тэатр ад агентуры клясавага ворага.

Нарэшце, нарада павінна ва ўсю шырыню паставіць лыганьне аб нашай драматургіі для гамадзейнага мастацтва, і ў першую чаргу для вёскі. Гэта зусім зразумела. Літаральна голад вас ковага рэпэртуару і вялізарныя патрабаваньні на п'есы з боку вёскі, якая перабудоўваецца на новы сацыялістычны лад, уласна высоўваць перад Саюзам Савецкіх Пісьменьнікаў задачу паставіць на належную вышыню драматургію, як адзін з галоўных атрадаў усёй літаратуры.

Мы спадзяемся, што праведзенае абгаварэньне задач нарады на буйнейшых прадпрыемствах г. Менску, у тэатральных калектывах, прысутнасьць на нарадзе прадстаўнікоў драматургіі брацкіх рэспублік, якія правялі падобныя нарады ў сваіх рэспубліках, увага да пастаўленых на нарадзе пытаньняў з боку нашага друку, — дадуць магчымасьць Аргкамітэту Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў і новаарганізаванай пры ім сэкцыі Драматургаў, падняць і глыбока распрацаваць пытаньне драматургіі, скліканьне нарады і пастаноўка гэтага пытаньня на зьездах ССП — усесаюзным і ўсебеларускім — яшчэ раз падкрэсьліваю ўсю важнасьць і перашчарговасьць задач драматургіі.

СПРАВА АБ ШКОДНІЦТВЕ НА ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯХ

Ранішняе пасяджэньне 13 красавіка

Ранішняе пасяджэньне 13 красавіка пачаюся допытам падсуднага СОКАЛАВА, які паведаміў суду, што ён у 1918 годзе пасьля сканчэньня сярэдняй мэханіка-тэхнічнай школы, паступіў у белую армію, служыў у вучэбнай роце дзе 22-га Златаустоўскага палка разам з Гусевым. Прымаў удзел у паходах супроць Чырвонай арміі. Пры развале белай арміі Сокалаў застаўся ў Томску, і калі горад быў заняты Чырвонай арміяй, ён паступіў санітарам у ваенны шпіталь. Потым паступіў у ваенную радыё-школу; скончыўшы яе, працаваў у ваенной радыё-тэлеграфнай майстэрні. Пасьля дэмабілізацыі ў 1924 годзе прыехаў у Златаўст і тут стаў працаваць на мэханічным, а потым на мэтэаралягічным заводзе. З мая 1932 году працаваў памочнікам гапоўнага мэханіка па электрычнай частцы Златаустаўскага мэтэаралягічнага заводу. Атрымліваў 700 руб. у месяц.

Адказваючы на пытаньні старшыні тав. Ульрыха, Сокалаў паведаміў, што ён стаў займацца шкодніцкай работай з 1927 году па прапанове інжынэра Вітвіцкага, які тады быў начальнікам электраэтанцыі ў Златаўсьце. Сокалаў па яго даручэньні затрымаў работу па ўключэньні перадатачных трансфарматараў на станцыі, перазод на лабочнае ўзбуджэньне турбагенэратара Взотынгауза і затрымаў работу турбіны Цэльпі. З чэрвеня 1930 году, калі ён быў прадстаўлен Гусевым Мандзанальду, як «свой чалавек», антысавецкі настроены, Сокалаў прымаў удзел на кватэры Мандзанальда ў «вечарынках», на якіх вялася антысавецкія гутаркі, агалошваліся антысавецкія тосты, а некальні пазьней Сокалаў прыступіў па даручэньні Мандзанальда, да сыстэматычнага падрыву работы заводаў, у той-жа час зьбіраў і перадаваў Мандзанальду весткі аб рабоце ваенных заводаў. Працягваючы свае паказаньні, Сокалаў заявіў: «Мандзанальд гаварыў мне — на вас з Гусевым усклядаецца арганізацыя аварый і дывэрсыйных актаў. Аб усім гэтым вы дагаварэцеся з Гусевым».

Гусеў на пытаньне пракурора тав. Вышынскага пацьвярджае, што Мандзанальд сапраўды гаварыў яму аб тым, што Сокалаў можа быць скарыстаны для выкананьня распрацаванага пляну аварый.

Тав. Вышынскі, нагадваючы Мандзанальду яго паказаньні на папярэднім сьледзтве, прыводзіць наступную вытрымку з паказаньняў Мандзанальда: «У дадатак да раней даных паказаньняў, пацьвярджаю, што ў канцы 1930 году пры гутарцы з Сокалавым я, не даючы яму канкрэтнага заданьня па псаваньні абсталяваньня, сказаў, што на яго і Гусева ўскладаецца правядзеньне работы па псаваньні абсталяваньня і што ён, Сокалаў, павінен па гэтым пытаньні дагаварыцца непасрэдна з Гусевым». На запытаньне пракурора Мандзанальду — чаму ён даў такія паказаньні, Мандзанальд заяўляе, што ён «лічыў зручным зрабіць падобную заяву пры тагачасных абставінах допыту».

Высьвятляючы, якія-ж абставіны былі тады, тав. Вышынскі зварачае ўвагу суда, што паказаньні толькі што агалошаныя, падпісаны ўласнаручна Мандзанальдам. Мандзанальд чытае даныя ім паказаньні на папярэднім сьледзтве і заяўляе: «Так, гэта я падпісаў».

Тав. ВЫШЫНСКІ пытае: «Пры якіхжа ўмовах вы падпісалі гэта? Мо' пры допыце ўжывалі якія-небудзь асобныя мэтады?

МАНДЗАНАЛЬД. — Не.

Мандзанальд робіць таксама спробу адмаўляцца ад сваіх паказаньняў, зробленых ім на папярэднім сьледзтве 12 сакавіка па атрыманьні ім грошай ад Тарнтона для шпіёнскай работы. Але пасьля перакрыжаваных пытаньняў, Мандзанальд заявіў, што ён атрымаў грошы ад гапоўнага інжынэра мантажнага аддзелу канторы «Мэтра-Вікерс» Тарнтона. Тав. Вышынскі прад'яўляе Мандзанальду напісаныя ім уласнаручна на ангельскай мове паказаньні ад 12 сакавіка па гэтым пытаньні. На запытаньне тав. Вышынскага, чаму ён тады пісаў адно, а сёньня робіць спробы гаварыць другое, Мандзанальд праз перакладчыка гаворыць: «Калі яму прад'явілі паказаньні Тарнтона і цэлы рад іншых паказаньняў, дык ён парашыў, што паводле складзеных абставін, маючы супроць сябе столькі паказаньняў, яму трэба рабіць іменна такія паказаньні, якія ёсьць у справе, і што асаблівы ўплыў на яго зрабілі паказаньні Тарнтона, які выкрыў, што ён, Тарнтон, скарыстаў Мандзанальда для зьбіраньня інфармацыі аб палітычным, эканамічным і ваенным становішчы ў Златаустаўскім раёне».

ВЫШЫНСКІ. — І парашылі, што далей адмаўляць бескарысна? Правільна?

МАНДЗАНАЛЬД. — Так.

Тав. Вышынскі пасьля гэтага задае рад пытаньняў Тарнтону з поваду яго паказаньняў на папярэднім сьледзтве, ад якіх Тарнтон прабуе цяпер адмаўляцца, лічачы, што ён тады даў няправільныя паказаньні.

ВЫШЫНСКІ. — Чаму вы далі няправільныя паказаньні?

ТАРНТОН. — Я быў вельмі ўсхваляваны і страціў мужнасьць...

Тав. Вышынскі задае пытаньне Мандзанальду: «Чаму-ж вы, служачы фірмы «Мэтра-Вікерс», атрымлівалі весткі, якія ніякіх адносін да фірмы ня маюць? Для каго вы атрымлівалі весткі аб выпабе знарадаў?

МАНДЗАНАЛЬД. — Ні для кога, для сябе...

ВЫШЫНСКІ. — Чаму вас цікавілі знарады?

МАНДЗАНАЛЬД. — З цікавасьці.

Старшыня тав. Ульрых, указваючы, што Тарнтон даў свае паказаньні на папярэднім сьледзтве, калі ён, паводле яго споў, быццам-бы «страціў мужнасьць», пытае Тарнтона, калі да яго вярнулася мужнасьць, отрачаная 12 сакавіка?

ТАРНТОН. — Мужнасьць вярнулася да мяне 4 красавіка.

СТАРШЫНЯ. — У якой гадзіне?

ТАРНТОН. — У 6 гадзін...

Тав. Вышынскі, рэзюмуючы паказаньні Сокалава, гаворыць: «Такім чынам, Сокалаў атрымаў 1.000 рублёў ад Гусева. Гусеў атрымаў 1.000 рублёў і больш ад Мандзанальда. Гэта пацьвярджаюць Сокалаў, Гусеў і Мандзанальд. Сокалаў зьбіраў і даваў весткі ваеннага характару. Гэта пацьвярджаі Сокалаў і Мандзанальд, які атрымліваў гэтыя весткі. Тав. Вышынскі задае пытаньне Сокалаву: «Правільна?»

СОКАЛАЎ. — Так.

ВЫШЫНСКІ, зварачаючыся да Гусева: «Правільна?»

ГУСЕЎ. — Так.

ВЫШЫНСКІ. — Мандзанальд, правільна?

МАНДЗАНАЛЬД. — Так.

ВЫШЫНСКІ. — Больш у мяне пытаньняў да Сокалава няма.

Пачынаецца допыт падсуднага Мандзанальда, які расказвае суду, што яго шкодніцкая шпіёнская работа пачалася зараз-жа пасьля прыезду яго ў СССР у канцы 1928 году. Ён працаваў у Маскве на першай МДЭС потым у Ленінградзе на 5-й ДЭС. У Ленінградзе ён зьбіраў для Тарнтона весткі рознага

ВЫШЫНСКІ. — Для якіх мэт гэтыя весткі патрэбны былі?

МАКДАНАЛЬД. — Гэта... мне было цікава.

Далей з пытаньняў высьвятляецца, што Мандзанальд зьбіраў і перадаваў весткі аб авіяцыйных маторах і аб выпрабаваньні гармат на палігонах. Паводле прызнаньня Мандзанальда, Тарнтон быў задаволен яго работай.

Тав. Вышынскі задае рад пытаньняў Тарнтону ў сувязі з паказаньнямі Мандзанальда. Тарнтон адказвае вельмі асьцярожна, узважваючы кожнае слова, ужываючы эрэдку такія споўні ў рускай мове, як «я загнуў на папярэднім сьледзтве», «гэта сказана вельмі громка» і інш. Тарнтон прабуе даказаць, што ён шпіёнскай работай не займаўся ў СССР. На пытаньне, чаму ён «вельмі загнуў» на папярэднім сьледзтве, Тарнтон зноў тлумачыць, што тады «страціў мужнасьць». А весткі, якія зьбіраліся па яго даручэньні Мандзанальдам і Гусевым, былі нібы ня больш, як «абываталькія весткі». На рад пытаньняў пракурора тав. Вышынскага Тарнтон прабуе ўхіліцца адказам: «Ня прыпомню».

ВЫШЫНСКІ. — Дык вы ня памятаеце? У вас што — наогул памяць слабая?

ТАРНТОН. — На лічбы слабая памяць.

ВЫШЫНСКІ. — На лічбы і факты.

З далейшага допыту Тарнтона, Мандзанальда і Гусева высьвятляецца, што Тарнтон выдаваў грошы за шпіёнскую работу раду асоб. 3.000 рублёў, выданых інжынэру Доўгаву, былі праведзены па кнігах фірмы «Мэтра-Вікерс» па рахунку «пераходзячых сум».

Тарнтон прабуе тлумачыць выдачу гэтых сродкаў, як аплату «звыштэрміновых», камандыровачных і г. д.

На пастаўленае ва ўлор Тарнтону запытаньне, ці зьбіраў ён весткі ваеннага характару, Тарнтон, урэшце, прызнаецца, што зьбіраў шпіёнскія весткі ваеннага характару і аб Пуціпаўскім і аб Мыцішынскім заводах.

Адказваючы на запытаньне нам. пракурора тав. Рагінскага — для чаго зьбіраліся ім весткі ваеннага характару, — Тарнтон адказвае: «Гэта факты абываталькія...».

На пытаньне — як гэтыя «абываталькія» весткі пападалі да яго — Тарнтон адказаў: «Мне гэтыя весткі папалі выпадкова».

ВЫШЫНСКІ. — Ад каго?

ТАРНТОН. — Я, дальбог, ня ведаю. Калі гаварыць падрабязна...

РАГІНСКІ. — Скажэце коратка — ад каго?

Тарнтон прабуе выкруціцца ад адказу, блытаецца і, нарэшце, заяўляе, што простыя адказы тут не падыходзяць, бо, паводле яго заявы, гэта яго топіць.

Тав. Рагінскі прыводзіць вытрымкі з паказаньняў Тарнтона, якія ён даў на папярэднім сьледзтве ў прысутнасьці пракурора рэспублікі, дзе ён прызнаў сябе вінаватым у шпіёнажы, у прыцягненьні да шпіёнскай дзейнасьці рускіх інжынэраў і тэхнікаў, і ў тым, што ён аплачваў іх за шпіёнскую работу і што гэту работу праводзіў арганізавана і рад работнікаў фірмы «Мэтра-Вікерс». Тарнтон прызнае, што ён гэтыя паказаньні сапраўды даў, але заяўляе, што яго паказаньні былі запісаны ня ім, а тав. Рагінскім. Тав. Рагінскі просіць суд прад'явіць Тарнтону паказаньні, даныя ім на папярэднім сьледзтве і запытацца ў падсуднага Тарнтона, хто іх пісаў.

Тэкст паказаньняў агглядваецца Тарнтонам.

РАГІНСКІ. — Гэта ваша рука?

ТАРНТОН. — Мая.

Зачытваецца заява Тарнтона, зробленая ім 19 сакавіка. «Гэтыя паказаньні мною даны зусім добраахвотна, без якога-б там ні было ўплыву ці націску. Паказаньні даны мною на ангельскай мове і падпісаны ўласнаручна. Пратаколы вочных ставак паміж мною і Гусевым і паміж мною і Кутузавай, прад'яўленыя мне на гэтым допыце, у якім я пацьвярдзіў факт сваёй шпіёнскай работы і мае сувязі з іншымі асобамі, я чытаў і ніякіх заўваг да запісаў пратаколаў зрабіць не магу.

Пратакол запісан правільна і пацьвярджан мэйм подпісам. Пратакол мною прачытан. Тарнтон, 9 сакавіка 1933 г.».

ВЫШЫНСКІ. — Вы пацьвярджаеце, што добраахвотна, без усякага націску давалі гэтыя паказаньні?

ТАРНТОН. — Так.

ВЫШЫНСКІ. — Вы прачыталі і потым падпісалі?

ТАРНТОН. — Так, і цяпер суд будзе іх разьбіраць.

Далей Тарнтон прабуе тлумачыць, што ён даў тады няправільныя весткі, бо ён быў напалохан.

СТАРШЫНЯ. — Як напалохан? Кім напалохан? Дзе і хто вас напохаў? Адказвайце дакладна, калі напалоханы, у якім пакоі?

ТАРНТОН. — Я проста баяўся, а чаго — і сам ня ведаю.

На пытаньні тав. Вышынскага аб тым, ці няма скажэньняў, фальсыфікацыі ці падтасоўкі яго паказаньняў — Тарнтон адказаў адмоўна.

Тав. Вышынскі задае рад пытаньняў Мандзанальду, які паведамляе, што ён пазіў усе лісты, якія атрымліваў ад Гусева.

Адказваючы свайму абаронцу Сьмірнову, Мандзанальд паведамляе, што ён у Англіі зарабляў 2½—3 фунты стэрлінгаў у тыдзень, а ў Расіі яму плацілі фірма. 12 фунтаў стэрлінгаў у тыдзень. У савецкай валюце ён атрымліваў 189 рублёў у месяц, а рэшту фірма пералічала на яго бягучы рахунак у Лёндане. Мандзанальд гаворыць, што ў яго стварылася вялікая запазычанасьць маскоўскай канторы фірмы, бо ён траціў шмат грошай на свае патрэбы. Абаронца Тарнтона Браўдэ прабуе прадставіць гэта так, што Тарнтон перадаваў Мандзанальду грошы на асабістыя патрэбы і ў доказ гэтага прад'яўляе суду дакумант аб пераводзе Мандзанальдам Тарнтону 66 фунтаў стэрлінгаў з Лёндану нібы на пакрыцьцё доўгу Тарнтону.

З далейшых пытаньняў высьвятляецца, што Тарнтон атрымаў з Англіі пераход на 66 фунтаў стэрлінгаў ад Мандзанальда і купіў на іх у аднаго нямецкага спэцыяліста савецкай валюты на 2.000 рублёў. Тарнтон прызнае, што гэты акт куплі савецкай валюты зьяўляецца незаконным. На пытаньне т. Вышынскага аб тым, ці маюць якія-небудзь адносіны да фірмы асабістыя яго прашовыя разрахункі з Мандзанальдам. Тарнтон адказвае адмоўна. Тады т. Вышынскі пытае — чаму-ж асабістыя рахункі яго, Мандзанальда, праведзены па кнізе асабістых рахункаў маскоўскай канторы «Мэтрапалітэн Вікерс», у якой значыцца выдача Мандзанальду 2.000 рублёў.

Тарнтон нічога ня можа растлумачыць суду, чаму гэта сума была праведзена па кнігах, рахункі якіх павінны адлюстроўваць толькі адносіны паміж фірмай і яе служачымі.

У канцы ранішняга пасяджэньня, суд [illegible]

Вячэрняе пасяджэньне 13 красавіка

У вячэрнім пасяджэньні аднаўляецца допыт падсуднага Тарнтона. Тав. Рагінскі пытаецца Тарнтона: ці давяліся ім, Тарнтонам, ці кім-небудзь з іншых кіруючых асоб маскоўскай канторы «Мэтрапалітэн Вікерс» даручэньні мацёрам ці мантажным інжынэрам зьбіраць якую-небудзь інфармацыю, ці якія-небудзь весткі на электрастанцыях?

ТАРНТОН. — Так, яны мне давалі весткі.

Мандзанальд пацьвярджае, што яму было дана Тарнтонам даручэньне зьбіраць весткі.

Тарнтон зараз на судзе адмаўляе гэта, хоць на вочнай стаўцы з Мандзанальдам на папярэднім сьледзтве ён прызнаў, што даваў даручэньне Мандзанальду зьбіраць інфармацыю, як пацьвердзіў гэта і на вочнай стаўцы з Гусевым. Але ён прызнае, што атрымліваў ад Мандзанальда весткі ня раз.

Тав. Рагінскі пытаецца, якога-ж роду былі гэтыя весткі? Ці былі гэтыя весткі аб ваенных выторвачасьці, аб знарадных загатоўках, аб тыпах знарадаў, аб пашырэньні ваенных цэхаў і г. д.?

МАКДАНАЛЬД. — Так, правільна.

РАГІНСКІ. — Якраз гэтыя весткі вы і атрымлівалі ад Гусева і перадавалі Тарнтону?

МАКДАНАЛЬД. — Так.

Для чаго-ж патрэбны былі такія весткі «абываталькія» Тарнтону? — пытаецца тав. Вышынскі. — Хіба ад іх залежыць работа турбагенэратара, масьлянікаў, турбіны?

На гэтыя запытаньні Тарнтон адказвае адмоўна і дае ўжо новыя тлумачэньні. Гэтыя весткі патрэбны былі Тарнтону, паводле яго споў, таму, што таварыства «Вікерс» дае крэдыты СССР.

ВЫШЫНСКІ. — Гэта значыць, вы праявралі крэдытаздольнасьць Савецкага саюзу праз вашых агентаў, вы мелі сваёй задачай праверыць крэдытаздольнасьць Савецкага ўраду?

ТАРНТОН. — Так.

ВЫШЫНСКІ. — Дазвольце зрабіць вывад: вы праз сетку сваіх агентаў — усіх Гусевых, Сокалавых і інш. — праявралі, наколькі моцна савецкая ўлада? Правільна?

ТАРНТОН. — Так, згодзен.

ВЫШЫНСКІ. — Вас цікавілі быт і палітычныя настроі рабочых для таго, каб мерказаць аб моцнасьці Савецкай улады? Правільна?

ТАРНТОН. — Так.

З далейшага апытаньня Тарнтона высьвятляецца, што зьбіраньнем шпіёнскіх вестак займаліся і іншыя інжынэры фірмы «Мэтрапалітэн Вікерс» — Кушні, Алейнік, Нордвол і інш. Тарнтон ня можа ня прызнаць усяго гэтага, але яму вельмі не падабаецца выраз «шпіёнскія».

Апытаны Манкгауз не адмаўляе, што інфармацыя зьбіралася, што яе перадавалі ў Лёндан. Усе агенты фірмы ў СССР абавязаны былі давець яму, Манкгаузу, гэтыя весткі ў парадку службовых абавязкаў. Тав. Рагінскі называе рад прозьвішчаў інжынэраў: Левінсон, Аляксеў-Папоў, Шлешаль, Вітвіцкі, Усаў, Сухаручнік, Зорын, Зівэрт, Крашэньнікаў, якія не знаходзіліся на службе «Мэтрапалітэн Вікерс», але тым ня менш давалі цікавячыя Тарнтона і Манкгауза весткі. Гэтага факту не адмаўляе ні Тарнтон, ні Манкгауз.

РАГІНСКІ. — Значыць, паміма вашых служачых у вас была яшчэ цэлая група людзей, якая не ўваходзіла ў склад вашых служачых, якія зьбіралі для вас пэўную інфармацыю?

ТАРНТОН. — Зьбіралі.

РАГІНСКІ. Давалі вам пэўную інфармацыю, а вы яе атрымлівалі?

ТАРНТОН. — Так, мы атрымлівалі.

Якога роду была гэта інфармацыя, яркі паказваюць адказы падсуднага Алейніка, мацёра фірмы «Мэтрапалітэн Вікерс». Алейнік паведамляе, што весткі закраналі работу чыгуначнага транспарту, ваенныя перавозкі, перасоўваньні войск, ваенны рыштунак, становішча ваеннага заводу і г. д.

Тарнтон прабуе выкруціцца ад простых адказаў на пытаньні пра зьбіраньне вестак аб выробе знарадаў у Златаўсьце, што ён цікавіўся гэтым толькі «абываталькіх». Тарнтон прабуе адмаўляць зьбіраньне вестак ваеннага характару нават пасьля таго, як Алейнік і Кутузава прызнаюць, што такога роду заданьні даваліся Тарнтонам і Манкгаузам. Падсуднае Кутузава паказвае, што пры ёй ня раз былі размовы паміж Тарнтонам і Манкгаузам, вызначаўшымі план разбурэньня станцыі, псаваньня абсталяваньня і арганізацыі аварый. Гаварылі яны ў прысутнасьці Кутузавай, паводле яе прызнаньня, таму, што яе не баяліся, яка там была «сваім чалавекам». Тарнтон пацьвярджае, што ён не баяўся ў прысутнасьці Кутузавай гаварыць «на дзепавыя тэмы».

На пытаньні тав. Вышынскага Тарнтон паказаў, што весткі, якія ён зьбіраў, перасылаліся ў Англію Тарнэру Рычардсу, дырэктару - распарадчыку «Мэтрапалітэн-Вікерс», які прыяжджаў амаль кожны год у СССР, пачынаючы з 1923 году. Рычардс, як канстатуе Тарнтон, быў у 1917 годзе ў Маскве, потым у Петраградзе прадстаўніком брытанскага Вэстынгауза. У 1918 годзе Рычардс быў у Архангельску ў складзе брытанскіх інтэрвэнцыяністкіх войск супроць савецкай улады ў якасьці афіцэра ангельскай контр-разьведкі («Інтэлідзэнс Сэрвіс»).

Манкгауз, былы ў гэты-ж час у складзе тых-жа брытанскіх інтэрвэнцыяністкіх войск, пацьвярджае, што Рычардс сапраўды быў афіцэрам разьведкі ў 1918 годзе, потым вярнуўся ў Англію і пазьней у 1918 годзе нелегальна перайшоў граніцу СССР праз Фінляндыю. Па просьбе тав. Вышынскага паказаньне Тарнтона ад 13 сакавіка агалошаецца на ангельскай мове членам суда тав. Мартэнцам. Тав. Вышынскі чытае па-расійску часткамі гэта паказаньне, якое пачынаецца так:

«Уся наша шпіёнская дзейнасьць на тэрыторыі СССР кіраваласа брытанскай разьведачнай службай праз яе агента Рычардса, які займае пасаду дырэктара-распарадчыка кампаніі «Мэтрапалітэн-Вікерс электрыкаў Экспарт».

ТАРНТОН. — Я хачу адмаўляць гэты дакумант цалкам.

СТАРШЫНЯ. — Аднаго вашага жаданьня мала.

ВЫШЫНСКІ. — А в

СЕНЬНЯ ПЕРШЫ ДЗЕНЬ МАСАВАЙ СЯЎБЫ

ДА 25 КРАСАВІКА ЗАСЕЯЦЬ 500.000 ГЭКТАРАЎ АЎСА!

ТЭЛЕГРАМА ЦК КП(б)Б І СНК БССР

САКРАТАРОМ РК, СТАРШЫНЯМ РВК

ПАСТАНОВАЙ ЦК І СНК ПЯТНАЦЦАТАЕ КРАСАВІКА АБВЕШЧАНА ПЕРШЫМ ДНЕМ МАСАВАГА ВОРЫВА, БАРАНАВАНЬНЯ І СЯЎБЫ.

ЦЭНТРАЛЬНАЯ ЗАДАЧАЙ ПЕРШАЙ ДЭКАДЫ СЯЎБЫ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ПАСЕЎ ПАУМІЛЬЁНУ ГЭКТАРАЎ АЎСА, У ІЛЬНЯНЫХ РАЁНАХ, АПРОЧ ТАГО, РАЗГОРТВАНЬНЕ МАСАВАЙ СЯЎБЫ ІЛЬНУ.

ДА ДВАЦЦАЦЬ ПЯТАГА КРАСАВІКА БЕЛАРУСЬ ПАВІННА ЗАСЕЯЦЬ 500.000 ГА АЎСА.

ЦК І СНК ПАДКРЭСЛІВАЮЦЬ, ШТО ПАЛІТЫЧНАЯ АБСТАНОЎКА НА ВЕСЦЫ, УМАЦАВАНЬНЕ РАЕННЫХ ЗЬВЕНЬНЯЎ ПАРТЫЙНАГА І САВЕЦКАГА АПАРАТУ ДАЮЦЬ УСЕ МАГЧЫМАСЬЦІ ПРАВЕСЬЦІ СЯЎБУ АРГАНІЗАВАНА, ПА-БАЯВОМУ. ТЭМПЫ СЯЎБЫ ЦАЛКАМ ЗАЛЕЖАЦЬ АД КІРАЎНІЦТВА ПАРТЫЙНЫХ І САВЕЦКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ, МТС І САЎГАСАЎ.

МАБІЛІЗУЙЦЕ МАСЫ КАЛГАСЬНІКАЎ І АДНААСОБНІКАЎ НА РАНЬНЮЮ СЯЎБУ, ДАБІВАЮЧЫСЯ, КАБ ІМЕННА Ў ПЕРШЫЯ ДНІ СЯЎБЫ БЫЛІ ЎЗЯТЫ ЎДАРНЫЯ ТЭМПЫ, СТВАРАЮЧЫ ВЫРАЗНАСЬЦЬ І АРГАНІЗАВАНАСЬЦЬ РАБОТЫ ЎСІХ КАЛГАСЬНІКАЎ І АДНААСОБНІКАЎ.

КІНЬЦЕ Ў ПЕРШЫЯ ДНІ СЯЎБЫ АБСАЛЮТНА. ЎСЕ СІЛЫ РАЕНУ, ВЕСКІ НА ПОЛЕ. ПЯТНАЦЦАТАГА КРАСАВІКА Ў РАЁНЫ ЗНОЎ ВЫЯЖДЖАЮЦЬ САКРАТАРЫ ЦК, ЧЛЕНЫ БЮРО ЦК І НАРКОМЫ.

ГІКАЛО, ГАЛАДЗЕД.

ЗАСЕЯНА 4.100 ГЭКТАРАЎ

ПАВОДЛЕ ДАНЫХ НАРКАМЗЕМУ БССР, 51 РАЁН ПАЧАЎ СЯЎБУ РАНЬНІХ ЯРАВЫХ. НА 13 КРАСАВІКА ПА БССР ЗАСЕЯНА 4.100 ГЭКТАРАЎ, У ТЫМ ЛІКУ КАЛГАСЫ ЗАСЕЯЛІ 3.498 ГА, САЎГАСЫ 25 І АДНААСОБНІКІ 577.

ПА КУЛЬТУРАХ ЗАСЕЯНАЯ ПЛОШЧА ПАДЗЯЛЯЕЦЦА НАСТУПНЫМ ЧЫНАМ:

АЎСА ЗАСЕЯНА 2.038 ГЭКТАРАЎ, ЯЧМЕНЮ — 411, ПШАНІЦЫ — 278, ЖЫТА ЯРАВОГА — 532, ІЛЬНУ — 442, ЛУБІНУ — 33, БАБОВЫХ — 38, КАНАПЕЛЬ — 6, БУЛЬБЫ — 98, ТРАЎ — 129, ВІКІ — 34 і СЭРАДЭЛЫ — 61.

МАСАВЫЯ ПАЛЯВЫЯ РАБОТЫ

УВАРАВІЧЫ, 11.

У раёне разгарнуліся масавыя палявыя работы. Першымі выйшлі ў поле саўгас «Камунар» і калгасы — «Перамога», «Чырвоны брыгадзір», «Чырвоны Кастрычнік», «Прабуджэньне» і іншыя.

Саўгас «Камунар» ужо ўзарай усю зямлю, якую восенью не пасышелі ўзяць пад зяблёва.

У саўгасе Старая Беліца ўжо ўзарана звыш 100 га.

Добра разгортваецца ворыва ў калгасе «Прабуджэньне». За адзін дзень калгас 7 плугамі ўзараў амаль 4 га. У сярэднім па 0,52 га на аднаго каня. Пачаў палявыя работы і калгас «Чырвоны Кастрычнік». Ужо ўзарана 11 га. 3 першага-ж дня паляводчыя брыгады калгасу «Чырвоны Кастрычнік» поўнасьцю выконваюць норму ворыва. У калгасе разгарнулася раньняя сяўба пшаніцы і ячменю.

Калгас імя Сталіна 8 красавіка за адзін дзень вывез на палі 500 вазоў гною. Калгасьнікі прыступаюць да сяўбы раньняй бульбы. У паасобных калгасах сяўба раньняй бульбы ўжо разгарнулася. Так, калгас «Росквіт» ужо засеяў 4 га бульбы.

Шырока разгортваецца палявыя работы і ў калгасе «Камінтэрн». Дзьве паляводчыя брыгады гэтага калгасу ўзаралі каля 100 га.

75 ПРОЦ. ПЛЯНУ

ЛЕЗНА, 14. У раёне канчаецца вызначальная сяўба ільну. На 11 красавіка засеяна 152 гэктары ільну — 75 проц. пляну. Калгасы, якія абслугоўваюцца МТС, засеялі 114 га ільну.

У ЕЛЬСКУ ІГНАРУЮЦЬ АДНААСОБНІКА

ЕЛЬСК, 12. (Наш кар.).

У раёне каля 3.000 аднаасобных гаспадарак. Райземаддзел, аднак, злачынна ігнаруе аднаасобны сэктар. Ніякай дапамогі, ніякага кіраўніцтва. Напуе поўны самацёк.

Загадчык райземаддзелу Карась запэўнае, што адвод зямлі для аднаасобных гаспадарак поўнасьцю скончан. Гэта — яўнае ашуканства. У раёне разгарнулася масавая сяўба, а многія аднаасобнікі яшчэ і цяпер ня ведаюць, дзе ім сеяць. Зямля не адведзена.

У Старавысоцкі сельсавет зьявіўся аднаасобнік Трошка са скаргай, што яму няма дзе сеяць. Аказваецца, сельсавет прапанаваў гэтаму аднаасобніку сеяць на зямлі, якая ўжо даўным-даўно занята. Скарга ня прынесла ніякіх вынікаў. Трошка так і не атрымаў адказу. Яму проста прапанавалі... пакінуць сельсавет. Аналёгічныя факты ёсьць і ў іншых сельсаветах.

Ігнараваньне аднаасобніка ставіць пад пагрозу далейшае разгортваньне масавай сяўбы ў раёне. Райком і РВК абавязаны неадкладна прыняць рашучыя і неадкладныя меры. Ельскі.

НІ АДНАГО СПАЗЬНЕНЬНЯ

ЖЛОБІН, 12.

Калгас «Чырвоная рудня» з першых дзён сяўбы ўзорна праводзіць палявыя работы. На 10 красавіка паляводчыя брыгады калгасу ўзаралі пад раньнія яравыя культуры 35 га. Ужо засеяна 40 гэктараў канюшыны. 50 га забаранавана. На палі калгасаў вывезена звыш 1.000 вазоў гною.

На палявых работах, як і ў самым калгасе, устаноўлена моцная працоўная дысцыпліна. Няма ні аднаго прагулу, ні аднаго спазьненьня. Калгасьнікі сваячасова выходзяць у поле.

ПЕРШЫ ВЫХАД Ў ПОЛЕ КАЛГАСУ ІМЯ ДЗЯРЖЫНСКАГА (МЕНСК).

УРОКІ ПЕРШАЙ БАРАЗНЫ

ПЯТРЫКОЎ, 12. (Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

Калгас імя Молатава, Ляскавіцкага сельсавету, хвалілі .Па падрыхтоўцы да сяўбы яго лічылі адным з лепшых ня толькі ў сельсавеце, але і ў раёне.

Праўленьне без канца рапартавала: насеньне ссыпана, поўнасьцю ачышчана і адсартавана, арганізаваны 3 вытворчыя брыгады. За кожнай брыгадай замацаваны коні, інвэнтар і вытворчыя вучасткі. Яшчэ 23 сакавіка праведзен пробны выезд.

Старшыня калгасу Іван Сугрэй упэўнена заяўляў сельсавету, партячэйцы і раённым арганізацыям:

— Мы да сяўбы гатовы на ўсе сто!..

Сапраўдную якасьць гэтай гатоўнасьці паказаў першы дзень палявых работ калгасу ў полі — пятага красавіка.

З самага ранку калгасны двор запоўніўся калгасьнікамі.

Ніхто ня ведае, што і дзе яму рабіць. Аказваецца ў сапраўднасьці людзі не расстаўлены па брыгадах. Брыгады былі створаны толькі на паперы. Інвэнтар ня толькі не замацаваны за паасобнымі калгасьнікамі, а нават і за брыгадамі.

Паміж брыгадзірамі адразу пачаліся гарачыя спрэчкі.

— Гэта мае калёсы, крычыць брыгадзір Міхась Пінчук.

— Ды не твае, а мае, — хвалюецца ў сваю чаргу брыгадзір Шыўка.

— Куды ты цягнеш барану, яна-ж замацавана за маёй брыгадай, — абураецца брыгадзір Мікола Батан.

— Ня хлусі, барана замацавана не за тваёй, а за маёй брыгадай, — адказвае Шыўка, — ды, пагоцл, чаму гэта ты для сваёй брыгады захапіў усе новыя бораны, а мне пакінуў старыя.

На ўсе гэтыя спрэчкі было патрачана каля 2 гадзін. Нарэшце, коні запрэжаны. Калгасьнікі рушылі ў поле.

На полі зноў спрэчкі з-за вучасткаў. Дзе і каму працаваць — невядома. Кожны брыгадзір імкнецца хутчэй захапіць лепшы вучастак для сваёй брыгады.

Нарэшце, так-сяк справа ўладжана і тут. Вучасткі ўказаны. Брыгады разьведзены на палёх.

— Ну, пашлі, хлопцы, — і брыгадзір Пінчук Міхась павёў першую барозну.

Сьледам за ім параконныя плугі, урэзаўшыся ў рыхлую глебу, адзін за адным пачалі адлічваць першыя барозны на сьвежай ральлі.

— Што такое? Плуг нешта скача, як пярэт...

— Таварыш Пінчук! Мой плуг ня ідзе за коньмі, а ўсё прэцца ў бакі, — крычыць уздагон брыгадзіру калгасьнік Іван Краўчэня.

— Вось дык плуг, чорт бы яго пабраў, скача з аднаго боку ў другі, — скардзіцца калгасьнік Чыжык.

Некалькі гадзін нікудышнай работы. Некалькі гадзін спрочак, хто вінават — плугі ці аратыя. Вылучаюць найбольш вопытных аратых на выпрабаваньне плугоў. Сумныя вынікі. Ня ворыва, а адны агрэхі.

У першы-ж дзень з 23 плугоў, адрамантаваных для веснавой сяўбы, 8 прышлося здаць у паўторны рамонт. Аказваецца, каваль Гапенка так адрамантаваў плугі, што ва іх цяпер нельга арань. Праўленьне калгасу верыла кавалю на слова. Адрамантаваны, дык адрамантаваны. Цяпер прыходзіцца расплачвацца частковым спынэньнем палявых работ.

Ці ўлічаны гэтыя ўрокі? Нічога падобнага!

1 па сёмешні дзень інвэнтар не замацоран за брыгадамі і паасобнымі калгасьнікамі.

Няма асноўнага — вытворчага пляну. Толькі 8 красавіка праўленьне калгасу разглядзела вытворчы плян. На сходзе-ж калгасьнікаў плян ашчэ і зараз не абгаворан. Калгасьнікі нічога ня ведаюць аб нормах выпрацоўкі і аплаце працы. Аб севазвароце нават і ня думаюць. У калгасе і гэтай вясной пакідаюць... трохпалёўку.

Працоўная дысцыпліна расхістана. З прагулямі ніхто не змагаецца. Калгасьнік Мікола Сугрэй, напрыклад, і іншыя штодзенна выходзяць на работу са значным спазьненьнем. Ніякія меры ўзьдзейнасьці, адпак, ня прымаюцца.

Фармальна кожны конь замацоран за паасобным калгасьнікам. Але праўленьне ня сочыць за доглядам цягавай сілы. Некаторыя калгасьнікі папікаюць адносяцца да коняй. Калгасьнік С. Жукавец, да рэчы, член ЛКСМБ, нядаўна пакалечыў каня. Ужо нак яго застаўся непакараным.

Такавы рапарты і сапраўднасьць. Калі-ж зробіць адсюль адпаведныя вывады раённыя арганізацыі?

М. Р.

ДОГЛЯД ПА ЧАРЗЕ...

ГАРАДОК, 12.

У Гарадку даволі своеасабліва адклікаюцца на сыгналы друку. Што-б ня пісалі пра раён — мясцовыя арганізацыі далікатна маўчаць. Проста можна падумаць, што гутарка ідзе аб кім хочаце, толькі не пра іх раён.

Амаль два месяцы назад «Зьвязда» сыгналізавала, што ў Гарадоцкім раёне зусім ня рыхтуюць каня да сяўбы.

Што было зроблена ў раёне? Нічога. Людзі толькі зрабілі від, што нічога ня бачаць.

Да чаго гэта прывяло? На калгасных стайнях па-ранейшаму пануе абязьлічка. У радзе калгасаў арудуюць кулацка-шкодніцкія элемэнты, якія імкнуцца падарваць конскае пагалоўе калгасаў.

Возьмеце, для прыкладу, калгас імя Дзяржынскага. Чаму коні калгасу такія худыя, зьбітыя і заежджаныя? Лёрчык ашчэньваецца проста. Конямі працуе ў калгасе былы кулак Савельлеў. Ён і арганізаваў тое, з дазволу сказаць, догляд коняй, што амаль уся цягавая сіла калгасу знаходзіцца ў самым дрэнным станоўішчы. Хто і на якім кані працуе ў калгасе — невядома. Усе коні абязьлічаны.

Або калгас «Маяк», Халемерскага сельсавету. Тут заяўляюць, што абязьлічка ліквідавана. А ў сапраўднасьці адны і тыя-ж коні даручаны... некалькі конюхам. Мала таго, праўленьне калгасу зрабіла так: адным конюхам даручыла выключна кармленьне коней, другім — паеньне, трэцім — чыстку і г. д. А ў выніку ніхто за каня не адказвае. Адным словам, самая махровая абязьлічка.

І тут, як і ў калгасе імя Дзяржынскага, на стайню пралез вораг. Конюх Марозаў часта паўмысьля не дае кармоў для коняй. Вось чаму гніе конскае пагалоўе.

У калгасе «Серп і молат» на віне брыгадзіра Чарняўскага (у мінулым кулак) усе коні захварэлі. Іх кармілі зёрнам гнілым турнэпсам.

Абязьлічаны коні і ў калгасе «Чырвоная зорка», Саладуцінскага сельсавету. Кожны калгасьнік, калі ідзе на работу, бярэ любога каня, якога толькі захопа. Лепшага каня ўжо заезьдзілі. Амаль ва ўсіх коняй пабіты холкі і сьпіны. У другім калгасе «Чырвоная зорка» (Зайкаўскі сельсавет) коняй дагледаюць па чарзе: сёньня адзін конюх, заўтра другі. У выніку коні худыя, няпрыгодныя да работы.

А чаго варты наступныя факты. У калгасе «Пралетары», Аляксандраўскага сельсавету, адзнаго каня прывязалі да дрэва ў кустох і... забылі потым адвязаць. Конь цэлыя тры дні стаяў на прывязі галодным. Другога каня паставілі на стайні і таксама цэлыя тры дні не корміў.

У райземаддзеле ёсьць спэцыяльны інспэктар па конягадоўлі. Паўлаў яго прозьвішча. Што-ж робіць гэты інспэктар? Цяжка сказаць. Ва ўсякім выпадку падрыхтоўкай каня да сяўбы ён зусім не займаецца.

І справа, зрозумела, не ў адным Паўлаве. Усё-ж факты, пра якія мы гаварылі вышэй, абвяшчаюцца на вачох раённых арганізацый!

Арк. 3.

НАДВЯЧОРАК І РАНІЦА БРЫГАДЫ

У канцылярыі калгасу «Іскра» (Касьцюковіцкі раён) на сьцяне нісіць размаляваны ў розныя колеры плян калгасных землеў, разьбітых на прастакутнікі. Гэта схема севазвароту. Лініі схемы, намаляваныя алоўкам, на полі адзначаны калочкамі.

Вясна ў «Іскры» пачалася не сакавіцкімі сонечнымі днямі, а ў дні зімней і марозаў.

— От, таму і парадку дабіліся, што кожны калгасьнік адказваецца за гаспадарку мае,—кажа Хапенка Раман, брыгадзір другой брыгады.

Зд гаспадарлівасьць, за спаравнасьць, за кемлівасьць даверылі Раману трэцюю частку калгаснага поля. Ён брыгадзірам ужо другі год. Раман зьвяся, асвоіўся з тым, што ён гаспадарыць на 85 гэктарах.

Іншыя ўцы сёлета першымі выйшлі ў поле. Брыгадзіры загадзя вызначылі сі вучасткі, загадзя далі рабочы плян брыгадам. Кожны ведае, дзе і што рабіць.

1 красавіка. Заўтра брыгада выхо дзіць у поле. Надвячоркам склікаў Раман Хапенка сваю брыгаду. Разам з брыгадай абмеркоўваецца плян работ заўтрашняга дня.

Ад праўленьня атрымалі парад— распачаць палявыя работы, расіпаць гной на трох гэктарах і ўзараць тры гэктары пад ячмень. Раман тут-жа разьмяркоўвае работу: на ворыва— 7 чалавек, на расіпку гною—5, а рэшту—на будаўніцтва і на расчарчэньне пасекі.

Раніцой сабраліся калгасьнікі на прары другой брыгады, дзе хаваецца інвэнтар і збруя, дзе заўсёды выбіраюцца яны.

Пад павецьцю радочкам стаялі калёсы, кожная пад асобным нумарам.

Па парадку на калочках вісела збруя. Кожны падыходзіў і браў замацаваны за ім хамут, лейцы і інш. рэчы.

Дзед Цімох крыху спазьніўся, пры бег засопшыся, калі ўжо брыгада рыхтавалася выехаць.

— А ці-ж мне што засталося?— пытаўся ён.

— Як «засталося»,—адказвіўся Раман.

— Ну, калёсы хоць пашыгучі якія?

— Твой нумар?

— 32.

— Дык вось, калёсы твае на лінэ і глядзяць,—адказаў брыгадзір. Хіба можна ўзяць хто калёсы, калі яны к табой замацаваны?

Арцём Шарэньёў таксама выказаў сваю крыўду.

— Чаму не пастаўлены арэць, чаму каня ня даў як усім гаспадарам?

— На ворыва атавіл лепшых,— адказвае брыгадзір. Табе такую работу даверыць ня можам, бо ведаем, як чэпбайлівага хлопца. Ты дакажы, што можаш сумленна працаваць на калгаснай гаспадарцы, апраўдай сябе на рабоце, тады і каня даверым.

Калёна рушыла ў поле.

25 гэктараў узаранага поля першым сьледам і 20 другім, 15 гэктараў засеянага ячменю — вось вынік першых дзён палявых работ калгасу «Іскра».

Іскраўцы штодзенна набіраюць тэмпы.

Ю. РУДЗЬКО.

СКІНУЛІ З РАХУНКУ

ПЯТРЫКОЎ, 11.

Калгасы разгортваюць масавую сяўбу. Недатупчаныя адсталі аднаасобнікі. Толькі некаторыя гаспадарлі прыступілі да палявых работ.

Гэта — не выкідкоцасьць. У Пятрыкоўскім раёне аднаасобны сэктар зайняе звыш 70 проц. Тым ня менш раённыя арганізацыі не прынялі сапраўдных мер, каб забясьпечыць посьпех сяўбы па аднаасобных гаспадарках. У раёне аднаасобніка проста скінулі з рахунку.

Чаго варта хоць-бы наступная заява кіраўніка райземаддзелу Чарэдніка:

— Аднаасобнікі пасеюць і без нашага кіраўніцтва, нашая справа займацца толькі калгасамі.

Ад райземаддзелу не адстаюць і сельсаветы, асабліва Ляскавіцкі. Стар шыня гэтага сельсавету Маркавец і сакратар парт'ячэйкі Шабоўцаў у адзін голас заяўляюць:

— Аднаасобны сэктар — ня наша справа.

Адсюль і вынікі. Нават і цяпер да аднаасобных гаспадарак яшчэ не даведзены цьвёрдыя пасеўныя планы. У вёсцы Дарашевічы, напрыклад, не даведзены планы да 120 гаспадарак. Тое-ж самае і ў вёсцы Ляскавічы. І тут планы да аднаасобнікаў не даведзены.

Блытні, пасеўных абавязацельстваў палюцца ў сельсавеце. Ніхто іх і ня дужае запаўняць. Працоўныя аднаасобнікі ня ведаюць, дзе, што і колькі трэба сеяць.

Не даведзены цьвёрдыя пасеўныя планы да аднаасобных гаспадарак таксама па Копыськім і Старыгалоўскім сельсаветах. У Старыгалоўскім сельсавеце замест дакладнага плянаваў даручаліся арэаліць так:

Сакратар мясцовай парт'ячэйкі Карп мае арганізаваў падворнае апытаньне аднаасобных гаспадарак, хто, колькі і чаго маркуе засеяць. Потым падлічылі і аказалася, што плян проба скарачаць на 300 га.

Дакуль пятрыкоўскае раённае кіраўніцтва будзе толькі спакойна назіраць факты?

М.

„УЛАДЖВАЙЦЕ САМІ...“

ЖЛОБІН, 12.

У самым буйным сельсавеце раёну — Маркавіцкім — ня скончан адвод зямлі для аднаасобных гаспадарак. Палова ўсіх працоўных аднаасобных гаспадарак сельсавету яшчэ і цяпер ня ведае, дзе ім сеяць.

Не дапаматаюць і шматлікія заявы ў райземаддзел аб адводзе зямлі. На ўсе заявы і скаргі аднаасобнікаў райземаддзел адказвае:

— Ваш сельсавет знаходзіцца вельмі далёка ад раённага цэнтру. Уладжвайце справу самі.

Да суровага адказу бюратэрнаў.

Г.

Фрыц Генэрт

член ЦК камуністычнай партыі Германіі

ШТО АДБЫВАЕЦЦА Ў ГЕРМАНІІ

У Германіі буржуазія разьвязала адкрыта грамадзянскую вайну супроць пролетарыяту, даючы сыгнал для новай хвалі сусьветнай рэакцыі і наступленьня капіталу. Яна пачала спраўляць першай, і гэтым самым яна паводзіць усе клясавыя супярэчнасьці да крайняга напружаньня, ушчэнт разьбівае сацыял-дэмакратычныя ілюзіі аб магчымасьці мірнага разьвіцьця і лішні раз паказвае, што шлях зьяўляецца асноўным «аргументам» буржуазіі. Падзеі ў Германіі — гэта вяк нейны крок на шляху вылупваньня рэвалюцыйнага крызісу ў цэнтры Эўропы, на шляху наближэньня рашаючых сонатак паміж працай і капіталам.

Тое, што адбываецца зараз у Германіі, паказвае ясна, якімі прогнамі будзе змагацца буржуазія ў момант, калі ні на чарзе дня стане пытаньне аб пралетарскай рэвалюцыі, і якімі срод камі пайдзе змагацца пралетарыят супроць буржуазіі і яе ланцуговых сабак.

У той-жа час падзеі ў Германіі паказваюць, што будзе ўяўляць сабою капіталістычны сьвет у выпадку новай імпэрыялістычнай вайны, і ў пры ватнасьці вайны супроць Савецкага саюзу, якая будзе пішыцца сацыял-дэмакратыі, зараз адкрыта перайшоўшай у Германіі на бок фашыстаў і чаму камуністы паклялісь сацыял-дэмакратаў вось ужо 3 гады сацыял-фашыстамі.

Нарэшце, падзеі ў Германіі набываюць тым большае значэньне, што пытаньне за ўладу Гітлера паставіць

Да падзей у Германіі прыкаваны погляды ўсяго міжнароднага пролетарыяту, і адны і тыя-ж пытаньні хвалююць сьвядомых рабочых кожнай краіны:

а) Чаму германскаму фашызму ўдалося прыйсьці да ўлады?

б) Якавы перспэктывы далейшага разьвіцьця Германіі?

в) Ці прайшла была палітыка камуністычнай партыі Германіі?

І. ЧАМУ ФАШЫЗМУ ЎДАЛОСЯ ПРЫЙСЬЦІ ДА ЎЛАДЫ?

Пытта адказаць на гэта пытаньне, калі цьвярозо не прааналізаваць расстаноўку клясавых сіл у Германіі.

І так, якава расстаноўка клясавых сіл у Германіі, якавы тая роля, якую адыграла германская сацыял-дэмакратыя ва ўстаўленьні фашысцкай дыктатуры?

Перш за ўсё—аб пролетарыяце.

У Германіі супрацьпаложэньне пролетарыяту фашызму абумоўлівалася тым, што адна частка пролетарыяту, большая яго частка, апікаемая сацыял-дэмакратамі, йшла за сацыял-дэмакратыяй, а гэта апошняя ў саюзе з буржуазіяй бакуцьмна змагалася супроць другой, меншай часткі пролетарыяту, яго камуністычнай часткі, якая зьяўляецца адзінай актыўнай і баявой сілай супроць фашызму. Чым больш урасталі ўплыў камэнартыі і яе арганізацыйная сила, тым больш зацятымі набіраліся спосабы сацыял-дэмакратыі супроць рабочых масы перад тварам наступаючага чаго фашызму.

Тая акалічнасьць, што ў Германіі сацыял-дэмакратыя ўдалося сарваць рэвалюцыйнае асьвяцьленьне пролетарыяту,—гэта акалічнасьць нарадзіла і пераўкінула пасьляхова ідэор рабочае клясы фашызму. Відэмаючы сацыяльны заказ буржуазіі, сацыял-дэмакратыя для таго змяніла і расклала пролетарыят, каб аслабіць яго баяздольнасьць. На працягу 14 год свайго прабываньня ў прускім урадзе сацыял-дэмакратыя, мякчы дзяржаўны, перш за ўсё паліцэйскі, апарат, бязупынна грабіла камуністычны авангард, вядомы, што гэтым самым яна аслабляе пролетарыят у цэлым, умацоўвае дыктатуру буржуазіі і падрыхтоўвае глебу для фашызму. У той-жа час сацыял-дэмакратыя, апіраючыся на апарат буржуазнай дзяржавы, імкнулася ўмацаваць свой уплыў у рабочай клясе і перашкодзіць рэвалюцыйнаму асэйству пролетарыяту як клясы. Пасьля расстрэлу рабочых 1-га мая 1929 г. (Берлін) сацыял-дэмакратыя забаранила самае чырвоных франтавікоў, забясьпечыўшы поўную свабоду арганізацыі Сталёвага шлему і штурмовым атрадам. Усе ўзброеныя сілы дзяржавы яна аддала ад поўнае кантроль фэдэральна-монархічнага афіцэрства рэйхсвэру. Пасьлядовіна Зьвярынам паліцыя таксама верна служыць зараз фашызму, як яна служыла прускаму ўраду сацыял-дэмакрата Брэўча ў яго барацьбе з клясавым рухам пролетарыяту.

Побач з гэтым, так сказаць, асэнным абязброеньнем пролетарыяту сацыял-дэмакратыя абязброіла яго і ідэйна тым, што, усыпляючы яго пільнасьць, фразамі аб «падкісэвай дзяржаве», яна пастуцова ідэйна ўзяла тым заваяваньнем, якія былі выраблены пролетарыятам у рэвалюцыі 1918-19 г. г. Пастаўшы ў крыві пра летарскую рэвалюцыю рукамі Носке ці іншым чынам, умацоўваць потым гім этапе, прадпрымаючы перашкаджаць усе спробы крызісу на плечы працоўных, пад выглядам палітыкі «цярпімасьці» да ўраду Брюнінга ў палітыкі «меншага зла» ў рэшце эканамічнага крызісу, сацыял-дэмакратыя расчысьціла шлях фашызму і скончыла тым, што цяпер адкрыта пераходзіць на яго бок.

Але яні ўплыў рабіла тая-ж палітыка сацыял-дэмакратыі на другім полюсе—у лягеры буржуазіі? Вядома, што сацыял-дэмакратыя ў рэвалюцыі 1918-19 г. г. не захапила прыйсьці ні буржуазіі, ні нават юнкерства, якое адкрыта ставала за манархічную рэакцыю ў Германіі. Вэймарская буржуазная рэспубліка была пабудавана рукамі сацыял-дэмакратыі па сутнасьці ці сарвана на тым-жа сацыяльна-эканамічным базісе, што і Гогенцолернаў ская манархія. І ўсю гэта акалічнасьць рабіла ўсю сыстэму ліспадаўскай буржуазнай дэмакратыі вельмі неўстойлівай і стварала глебу для росту шматлікіх і фашызму. Але і ўся далейшая пасьляваенная палітыка сацыял-дэмакратыі сарыяла таму, каб умацаваць эканамічныя і палітычныя пазыцыі буржуазіі.

На лініі эканамічнай гэта выявілася, з аднаго боку, у падтрымцы на літыні сыстэматычнага абграбленьня буржуазіяй рабочае клясы (скарачэньні заработнай платы і сацыяльных дапамог, павялічэньне падаткаў), з другога боку—у падтрымцы сацыял-дэмакратыяй палітыкі простай фінансавай дапамогі буйным прамысловцам і аграрам.

У галіне палітычнай сацыял-дэмакратыя на працягу ўсяго пасьляваеннага перыяду сыстэматычна ўмацоўвала магутнасьць капіталістычнай дзяржавы (паліцыя, рэйхсвэр, пабудова фашызоцкіх, рост тэрору супроць рабочае клясы). Гэта палітыка сацыял-дэмакратыі спрыяла згуртаваньню сіл буйнага капіталу, знайшоўшага ў момант найбольш жорсткага крызісу рамку ідэалу і тэрору супроць рабочай клясы і ўсіх працоўных.

Тут ляжыць ключ да разуменьня таго, чаму буржуазія «супрацьпачала» раней з сацыял-дэмакратыяй і чаму яна адказваецца цяпер нерайсцкай у Германіі да адкрытых форм фашысцкай дыктатуры.

Пярэйдзем да пытаньня аб гарадзкой дробнай буржуазіі і сялянстве.

Калі-б пролетарыят ня быў аслаблен і расколат сацыяльнай палітыкай клясавага супрацьпіцтва сацыял-дэмакратыі в буржуазіяй, яго рэвалюцыянізуючы ўплыў на гарадзкія дробна-буржуазныя пласты і сялянства, якія руйнуюцца крызісам і штурхаюцца на барацьбу з засільлем трэстаўскага капіталу, мог-бы быць забясьпечан.

Але што дала сацыял-дэмакратыя, будучы кіруючай партыяй, гэтым пра межным пластом, якія хісталіся паміж пралетарыятам і буржуазіяй? Вэймарскую рэспубліку? Але Вэймарская рэспубліка значала захаваньне капіталістычнага ладу пораўну з захаваньнем з яго цяжкім крызісам і жорсткай эксплёатацыяй, з узрастаючым хранічным беспрацоўем, усё больш значным руйнаваньнем сялянства і беспрасьвечным абяздольваньнем дробнай буржуазіі. Вэймарская рэспубліка была «палітычнай надбудовай» германскага капіталізму ў палацы ўсегулянага крызісу капіталізму, раны і балячкі якога ў момант мас увасабляліся ў тым палітычным ладзе, які стварала германская сацыял-дэмакратыя ў выніку свайго здрадніцтва пролетарскай рэвалюцыі. Нарэшце, Вэймарская рэспубліка,—і гэта асабліва важна, калі ўпадзе ня асноўе параконных ў сусьветнай вайне, зьявілася для мэю ўвасабленьнем версальскага ярма і пацяволенья германскага народу сусьветным імпэрыялізмам.

Дробна-буржуазныя масы кінулі ня рыць на сваім канкрэтным вопыце ў антынародзкай вопратцы. Злачынасьць палітыкі сацыял-дэмакратыі за ключалося ў тым, што яна буржуазную дэмакратыю, якая фашызавалася, высоўвала як сацыяльны ідэал. Усё больш штурхаючы сваёй палітыкай масы на расчараваньне буржуазнай дэмакратыяй, яна ў той-жа час злоўмыс пакідала на пралетарскую дыктатуру ў СССР адбрала ў іх усякую рэвалюцыйную перспэктыву на выхад з голаду і галечы.

Масы дробнай буржуазіі, пазбаўленыя да росткі беспрасьвечнасьцю ў сучасным і ня маючы надзей на будучыню, хапаліся ў рэзультыце здрадзецкай палітыкі сацыял-дэмакратыі за мары аб абнуцьцем, аб дакладным капіталізме вільгельмаўскай эпохі, калі германскі імпэрыялізм ішоў у Кітай, Багдад, у Афрыку, шматлікуючы ў той-жа час свайму ўплыву Балканы. Разам з тым версальскае ярмо жыцьцё і расчаравала шаўвіністычны запал, на якім праў фашызм. Хва ля шавінізму захапіла на толькі дробна-буржуазныя масы, але і пэўную частку пралетарыяту. Расколаты палітыкай сацыял-дэмакратыі пралетарыят аказаўся ня ў сілах перарабіць хвалю шаўвінізму супрацьчай хвалі інтэрнацыяналізму. А гэта акалічнасьць дала магчымасьць германскай буржуазіі, напалоханай балшым пугам камуністычнай часткі пралетарыяту, умацаваць сваё палітычнае ста новішча і перацяць улаву найбольш вострай рабочай клясе партыі—шаўвінізмам сацыялістам. Цяперашні германскі шаўвінізм ёсьць дойда Версалю, а французкая буржуазная дэмакратыя—апора версальскай сыстэмы— нарадзіла Гітлера.

У гэтай расстаноўцы клясавых сіл троба шукаць адказу, па-першае, чаму перад шырокімі масамі пралетарыяту германская кампартыя не магла ў цяперашніх умовах паставіць пытаньня аб захопе ўлады, па-другое, чаму камуністычная партыя Германіі, якая рэалізавала пазыцыі за сабой

ўдалося 30 ступеняў, у момант прыходу Гітлера да ўлады, прыняцьці фа шысцкую масавую палітычную забастоўку.

Такая стачка 30 ступеняў было-б вялізнайшай стачкабарацьбу. Пры сьпытаваньні правядзенай яна ня толькі мабілізавала-б усе сілы пролетарыяту, але выклікала-б сімпатыі ў шуках за фашыстамі масах пробуй буржуазіі і сялянства і пераканалась-б такім чынам у праўдзе масавых рэвалюцыйных дзеяньняў супроць фашызму, дыктатуры. Але імкнець такую Усегерманскае аб'яднаньне прафсаюзаў і сацыял-дэмакратыя лічылі шкідлівым заклік камуністаў да забастоўкі і сарвалі яе.

Яшчэ на XII пленуме ўказвалася на ізыно лініі разьвіцьця фашызму: у іншых краінах—сяньне ізаладзкую (Юга-Славія, Польшча, Італія), у другіх—узьнікненьню. Да ліку апошніх краін адноблася Германія. Але і ў гэтай узьнікненьні лініі германскага фашызму былі вялізныя хістаньні, намячаліся сымптомы ўзгрэтага крызісу, германскага фашызму (адыхо групы Ота Штрасэра, адыход Грэгора Штрасэра, розныя пасобныя штурмовых атрадаў, рэзкае вынікненьне чалаюў на выборах і г. д.).

Калі-б да 30 ступеняў і 30 ступеняў Усегерманскае аб'яднаньне прафсаюзаў і германская сацыял-дэмакратыя прынялі прапанову камкартыі аб адным фронце барацьбы супроць фашызму і супольна правялі-б масавую палітычную стачку, гэтым працэсы ўнутранога крызісу германскага фашызму пашлі-б пасторанным тэмпам. Але здрада сацыял-дэмакратыі далей падзеям іншы кірунак...

І калі камуністам удалося правесьці ў гэтай абстаноўцы пасобныя стачкі, дык гэта было ўжо сур'ёзным посьпехам. Але ў выніку здрады сацыял-дэмакратыі ім усё-ж не ўдалося 30 ступеняў правесьці рашаючую масавую палітычную стачку. Адтуль яна, што германскія камуністы не мага

Да пленуму Менгаркому КП(б)Б

Упор на якасьць партыйна-масавай работы

Ліпеньскі, а пазьней сьнежаньскі пленумы ЦК КП(б)Б мінулага году паставілі перад партарганізацыяй Беларусі, як адну з цэнтральных задач — перабудову партыйна-масавай работы. Важнасьць гэтых пастаноў зусім відавочна.

28 верасьня мінулага году ў спэцыяльнай пастанове «аб ходзе перабудовы партасавай работы на прадпрыемствах» ЦК КП(б)Б на асновах праверкі на мясцох (у тым ліку і на заводзе «Камунар») прызнаў, што перабудова ідзе невыстарчальнымі тэмпамі, што «ў наяўнасьці лупая недавацэнка палітычнага значэньня гэтай перабудовы».

Як партыйны калектыў заводу «Камунар» справіўся з тымі задачамі, якія былі пастаўлены перад ім у памянёнай пастанове ЦК КП(б)Б?

Пачнем з расстаноўкі партыйных сіл — гэтай рашаючай умовы выкананьня праміфінпляну.

Партыйны калектыў правёў даволі значную работу па ўмацаваньні важнейшых участкаў партыйнымі кадрамі. Пры наяўнасьці на заводзе 176 членаў і кандыдатаў партыі, з якіх непасрэдна на вытворчасьці працуе 152, на асноўным цэхі прыпадае абсалютная большасьць: на механічны — 48, на кавальны цэх — 30 чалавек.

Калі разьмеркаваньне партыйных сіл па цэхах праведзена ў асноўным правільна, дык унутры цэхаў гэтага няма. Так, група рабочых, якая працуе па ціскох (механічны цэх) даволі доўгі час на спраўлецца са сваімі заданьнямі. Прарыў у гэтай групе затрымлівае работу раду іншых цэхаў. У групе працуе толькі адзін камуніст. Здавалася-б, цэхавая партыйная ячэйка павінна была свае часова ўзмацніць гэту групу камуністамі. Між тым, гэта ня было зроблена. Сакратар цэхавай парт'ячэйкі тав. Лапідус з повану гэтага дае зусім «раманаўчыя» тлумачэньні: «На ціскох работа неквапіфікаваная і таму няма сэнсу перакідваць туды камуністаў». Недавацэнка малакваліфікаваных работы, неразуменьне сувязі яе з агульным становішчам выкананьня праміфінпляну прывялі да таго, што прарыў у групе не ліквідаван і да гэтага часу.

Як камуністы заводу «Камунар» змагаюцца за авангардную ролю ў барацьбе за праміфінплян?

Тут ёсьць бліскучыя ўзоры сапраўды ударнай работы. Камуністы сваім уласным прыкладам заражаюць энтузіязмам шырокія колы беспартыйных рабочых.

У ліцейным цэху высокакваліфікаваны фармаўшчык беспартыйны ІВАНОЎСКІ патрабаваў для вырабу шаблёну 10 гадзін, у той час, як ТНБ вызначана для гэтага 7 гадзін. Рэцэпція патрабаваньні Іваноўскага былі відавочны. Аднак, трэба было гэта даказаць на практыцы. Абавязаўся даказаць гэта рабочы, працаваўшы побач з ім, член партыі ЭДЭЛЬМАН—фармаўшчык значна ніжэйшай кваліфікацыі. І тав. Эдэльман яму даказаў. Ён выпусьціў шаблён за 6 з паловай гадзін. Нават вызначаны час ТНБ аказаўся перапавялічаным.

У кавальным цэху лепшым кавалём пічыцца член партыі тав. СІЎЧУК. Ён сыстэматычна перавыконвае норму коўкі 32-кілёграмных губак. Сутачная норма коўкі — 14,5 губак, а Сіўчук выпускае — 20 губак і добрай якасьці.

Значна перавыконвае нормы насечкі 32-кілёграмных губак член партыі БАЧЫЛА. Пры норме 45, ён насякае — 55.

А вось брыгада, што працуе на тачыльных варштатах. Яна амаль цалкам складаецца з камуністаў і камсамольцаў. На чале яе стаіць камуніст ТАРГОНСКІ. Гэтая брыгада ў студзені выканала плян на 100 проц., лютым — на 102 проц. і сакавіку — 108.

Аб авангардной ролі камуністаў можа сьведчыць і той факт, што з агульнага ліку 36 герояў пяцігодкі — 22 члены партыі.

Правільная расстаноўка партыйных сіл, бальшавіцкая прыкладнасьць камуністаў забясьпечыла выкананьне заводам праміфінпляну ў першым квартале гэтага году на 124,8 проц. і перавыкананьне якасных паказальнікаў.

Пры ўсіх гэтых дадатных баках нельга сказаць, што партарганізацыя заводу «Камунар» зрабіла ўжо ўсё для перабудовы партыйна-масавай работы, для «поўнага ахопу ўсіх рабочых палітычнай работай і бальшавіцкім уплывам». На заводзе «Камунар» ёсьць рад істотных недахопаў у пастаноўцы партыйнай работы, якіх нельга абыйсьці.

Партколектыў яшчэ не пераключыўся на канкрэтнае, аператыўнае кіраўніцтва нізавымі зьвёньнямі. 4-га лютага, напрыклад, бюро парткалектыву заслухала даклад аб выніках выкананьня праміфінпляну ў бляшным цэху за студзень. Сама сыстэма пастаноўкі на бюро дакладу аб выкананьні праміфінпляну асобных цэхаў заслугоўвае ўхваленьня. Аднак, пастанова бюро парткалектыву па гэтым пытаньні не канкрэтна. «Сакратару ячэйкі ўзмацніць партмасавую работу ў цэху». Вось паказаньні цэхавай ячэйкі. «Узмацніць работу» — такі асноўны стыль у кіраўніцтве бюро парткалектыву нізавымі партзьвёньнямі.

„АРЫТМЭТЫКА" І УДАРНІЦТВА

На заводзе «Камунар» ёсьць бліскучыя ўзоры сацыялістычных адносін да працы. У кожным цэху ідзе напружаная барацьба за выкананьне вытворчых заданьняў, ідзе сацыялістычнае спаборніцтва на хутчэйшае і якасна лепшае іх выкананьне. Аднак, улік спаборніцтва, вызначэньне ўдарніцтва арганізавана тут сваяасабліва. Кіраўніцтва заводу, парт'ячэйкі, заўком чамусьці лічаць, што ў іх на заводзе ўсе ўдарнікі. Не ўдарнікаў няма. Улічваюцца толькі лепшыя ўдарнікі.

— Лепшы ўдарнік, — гэта той, хто атрымлівае ўдарны паёк, — растлумачыў нам адзін рабочы. Гэта «расшыфроўка» назвы лепшага ўдарніка, аказаецца, зусім невыладковая. Яна мае пэўную падставу. Работніца ткацкай групы мэханічнага цэху ГАНЧАРОНАК на працягу доўгага часу зьяўляецца лепшай ударніцай. Яна сыстэматычна перавыконвала свой праміфінплян, актыўна ўдзельнічала ў грамадзкай рабоце. У сакавіку не хапіла пайкоў і таму яе выкрэсьлілі са сьпісаў лепшых ударнікаў. Нагогул за апошнія месяцы лік лепшых ударнікаў (па вестках заводакіраўніцтва) паменшыўся. У студзені было 246 лютым—240, сакавіку — 220. Здарылася гэта выключна таму, што ЗРК адпушчалася менш пайкоў. Характэрна, што скарачэньне ліку лепшых ударнікаў (а гэта знаходзіцца ў простай залежнасьці ад колькасьці адпушчаных пайкоў) ідзе ў першую чаргу за кошт жанчын-работніц. Вось пры ёмшчыца АСТАПЧЫК — доўгі час была ў складзе лепшых ударніц. Ня зьнізіла яна тэмпаў і зараз. У сакавіку яе выкрэсьлілі са сьпісаў лепшых ударнікаў. Тав. Астапчык спачатку саромілася высьвятляць прычыны гэтага, але раз сыпадкова сустрэўшы старшыню цэхкому запытала яго. Той проста пасіскаў плячыма і нічога ня мог адказаць.

Работніца МАХЛІНА таксама пазбаўлена годнасьці лепшай ударніцы толькі таму, што ў апошні час па неправераных прычынах паспабіла работу ў ячэйцы «Прыхільнікаў дзяцей», дзе яна зьяўляецца членам бюро. Аднак, тав. Махліна на тэй рабоце, якую яна выконвае, займае перадавое месца. У той час, калі рабочыя ў сярэднім зарабляюць 120 руб., яна выпрацоўвае — 180-185 руб. Выходзіць, што не вытворчыя паказальнікі вызначаюць годнасьць лепшых ударнікаў. Аб гэтым лепш за ўсё гаворыць тлумачэньні саміх сакратароў цэхавых парт'ячэек. Сакратар ячэйкі мэханічнага цэху тав. Лапідус падзяліўся з намі «арытмэтыкай» уліку лепшых ударнікаў: «У нас ёсьць 20 лепшых ударнікаў, якія атрымоўваюць ударныя пайкі. Гэты лік замацаваўся з пачатку першага кварталу. Мы сьвядома імкнемся затрымаць гэты лік, бо чэма больш пайкоў. Мы падганяем лік лепшых ударнікаў да ліку пайкоў».

Нічога сабе сыстэма.

А вось, што расказвае з гэтага повану сакратар ячэйкі кавальскага цэху тав. ЦІХАНАЎ. — «Склалі мы сьпіс на 30 лепшых ударнікаў. Перадалі ў заўком. Прышоў з заводакіраўніцтва тав. ПАЛЯКОЎ і заявіў: «Больш 28 пайкоў няма, скараці са свайго сьпісу 2 чал.». Прышлося шукаць каго скарачаць. Выкрэсьлілі тых, хто ў апошні час не наведваў заняткі партшколы». Такая сыстэма штучнай падгонкі ліку лепшых ударнікаў да ліку наяўных пайкоў ёсьць простае скажэньне прынцыпаў сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. І такая сыстэма існавала з ведама бюро парткалектыву і цэхавых ячэек, якія ня ўбачылі ў ёй нічога адмоўнага. Толькі зараз новае парткіраўніцтва анулявала гэты «мэтад».

СЭКТАРЫ ЦІ ПАРТОРГІ?

Некалькі слоў аб рабоце бюро цэхавых парт'ячэек. Іх работа адчуваецца на вытворчасьці. Але вынікі іх работы былі-б куды большымі, каб вакоп бюро быў згрупаван моцны партыйны актыў, калі-б было з іх боку штодзённае кіраўніцтва партгрупоргамі. Як-жа на справе? Сэктароў ні пры адной ячэйцы няма. Прычым, заслугоўвае ўвагі тое, што паасобныя сакратары нават не знаёмы з арганізацыйнай структурай ячэйкі. Сакратар ячэйкі кавальскага цэху ЦІХАНАЎ ня ведае, якія сэктары могуць быць арганізаваны. Ён, напрыклад, быў перакананы, што ў яго сэктары існуюць. Калі-ж мы запыталіся, якія імёны, ён адказаў, што парторгі (?!).

Партгрупы яшчэ не заняли належнае ім па праву месца на вытворчасьці. На групах, у брыгадах мала абмяркоўваюцца надзвычай пытаньні вытворчасьці, партыйнага будаўніцтва. Калі такія пытаньні і абмяркоўваюцца, дык вельмі часта яны зводзяцца да агульных разважаньняў. У партгрупе мэханічнага цэху (парторг тав. КОХАН) 30 сакавіка абмяркоўвалася пытаньне аб якасьці прадукцыі. Абмеркавалі і разышліся.

— Да чаго-ж канкрэтнага дагаварыліся? — пытаем у тав. Кохан.

— Браку ў нашай групе малавата, таму нічога практычнага і ня вызначылі, — самазадаволена яна адказала.

У першай зьмене кавальскага цэху тав. СІЎЧУК зьяўляецца адначасова і парторгам і прафоргам. Адсюль і вынікі: няма работы ні партыйнай, ні прафсаюзнай. — Калі ёсьць вольны час, зьбіраемся і газэты чытаем, — адказвае тав. СІЎЧУК на пытаньне аб тым, як ён спраўляецца са сваімі нагрузкамі. У яго ўяўленьні чытка газэт зьяўляецца самай каштоўнай формай партыйнай, прафсаюзнай работы. Гэта і ня дзіва: з боку цэхавай ячэйкі нілякага кіраўніцтва яго работай няма.

Студзеньскі пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) ва ўсю шырыню паставілі перад партыяй задачу асваеньня новых заводаў і новай тэхнікі. У сьвятле гэтага выкананьне заводам «Камунар» праграмы выпуску запасных частак для трактараў, асваеньне гэтага новага працэсу вытворчасьці—адказьнейшае заданьне, якое павінна было быць пастаўлена ў цэнтры ўвагі партарганізацыі. Між тым у радзе цэхаў (кавальны і інш.) партыйныя ячэйкі не ўзначалілі гэтай ганаровай барацьбы за хутчэйшае асваеньне новага віду работы.

Задача асваеньня — вялікая задача. Партарганізацыя абавязана штодзённа і штогадзінна змагацца за яе ажыцьцяўленьне.

АГІТАТАРЫ, ЯКІЯ НЯ ВЕДАЮЦЬ АБ ЧЫМ АГІТАВАЦЬ

Пытаньне ахопу палітычным уплывам кожнага рабочага, штодзённага растлумачэньня масам пастаноў партыі і ўраду — важнейшае пытаньне партарганізацыі. У гэтай сувязі роля групавых агітатараў выключна адказная. Не дарма ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове «аб групавых агітатарах і агітколектывах» (23 жніўня 1932 г.) зьвярнуў увагу партарганізацыі «на неабходнасьць сур'ёзнага і дасканалага падбору групавых агітатараў, на неабходнасьць вылучаць на гэту работу палітычна найбольш падрыхтаваных і вытрыманых партыйцаў (там, дзе няма партгрупы, у адзінкавых выпадках дапусьціць вылучэньне камсамольцаў у якасьці групавых агітатараў, у выключных выпадках — правераных у клясавай барацьбе беспартыйных ударнікаў рабочых і калгаснікаў), надаючы ёй такое-ж палітычнае значэньне, якое і рабоце парторга».

Ці выканаў парткалектыў заводу «Камунар» гэта зусім выразнае ўказаньне ЦК КП(б)Б? Не, ня выканаў. На заводзе налічваецца 19 групавых агітатараў, з іх членаў КП(б)Б — 8, кандыдатаў — 6, камсамольцаў — 3, беспартыйных — 2. Ні адзін з групавых агітатараў ня мае выстарчальнай палітычнай адукацыі. 5 агітатараў зусім ня маюць ніякай ні палітычнай, ні агульнай адукацыі, яны нават малапісьменныя. Адсюль зразумела і якасьць іх работы. Нілага кіраўніцтва агітатарамі з боку бюро парткалектыву і цэхячэек няма. Праўда, да сакавіка існаваў агітколектыў. Раз у дэкаду зьбіраліся агітатары. Праводзілі з імі гутаркі на розныя бягучыя тэмы, але ні разу іх не інструктавалі, ЯК ім трэба працаваць, не абмеркавалі пытаньні, якія сёньня хвалююць рабочых. Больш месяца як гэтых заняткаў ня было. Кожны групавы агітатар мае па некалькі іншых нагрузак, пры чым характар гэтых нагрузак нікольні ня спрыяе росту яго палітычнага ўзроўню. І гэта посьля таго, як у верасьнёўскай пастанове ЦК КП(б)Б спэцыяльным пунктам запісана:

«Ва многіх фабрычна-заводзкіх ячэйках групавыя агітатары яшчэ ня вылучаны. А там, дзе яны вылучаны («Камунар», імя Ланцуцкага, «Кастрычнік», камбінат «Камінтэрн» і г. д.) работа гэта праароблена чыста фармальна. Таварышы вылучаны бяз іх ведама, не ослабанены ад іншых партнагрузак. Не інструктуюцца. Сакратары ня ведаюць групавых агітатараў».

Аб рабоце агітатараў, аб іх падрыхтоўцы найбольш поўна расказваюць яны самі. Вось групавы агітатар другой зьмены мэханічнага цэху ШЧУРОВІЧ. Яму даручана абслужыць 46 рабочых. Задача вельмі адказная. Трэба скарыстаць «самыя рознастайныя мэтады і формы растлумачальнай работы, — гуткі, чытаньне ў голас, звычайныя гутаркі ў часе абедзенага перапынку, у вечарнім адпачынку...», а Шчуровіч сам малапісьменны, ён рэдка калі чытае «Праўду», і да таго-ж, ён нават ня ведае сам дакладна свае абавязкі.

Выпучылі агітатарам, а што рабіць ніхто не сказаў... Ня дзіва, што Шчуровіча, як агітатара рабочыя ня ведаюць, бо ён за 5 месяцаў яшчэ ні адной чыткі газэт, ні адной гуткі не правёў.

У кавальскім цэху агітатарам зьяўляецца камсамолец ТРУШКЕВІЧ. Палітычна мала падрыхтаваны. «Праўду», — як заявіў ён, — «толькі праглядваю». Самастойна адказваць на запытаньні рабочых ён ня ў стане. У лютым работы задалі яму 5 запытаньняў, ён іх перадаў у партабінэт і адказу рабочым не атрымалі. З таго часу больш запытаньняў рабочым не задавалі.

Так выглядае зьмест работы групавых агітатараў на заводзе «Камунар». Можна сказаць, што бюро парткалектыву і цэхавых ячэек, проста недаацанілі ролю агітатараў. І тут ня лішнім будзе напомніць зноў-такі пастанову ЦК КП(б)Б, дзе сказана: «Абавязаць сакратароў ячэек зьвярнуць на справу кіраўніцтва групавымі агітатарамі такую-ж увагу, як і на справу кіраўніцтва групорга, у той-жа час вядучы рашучую барацьбу з недаацэнкай палітычнай ролі агітатара».

Трэба таксама адзначыць, што дакладнай падрыхтоўкі да партдзён амаль няма. Яна ўсяго заключаецца ў тым, што за дзень раней вывешваюцца аб'явы. Палітдні па цэхах не праводзяцца. Пытаньнямі культурна-бытавога абслугоўваньня рабочых партарганізацыя зай мецца ад выпадку да выпадку.

Мы сьвядома спыніліся больш падробязна на адмоўных баках партыйна-масавай работы на заводзе «Камунар» для таго, каб завастрыць увагу партыйнай арганізацыі заводу на тое, што «ў сучасны момант ячэйкі павінны цэнтральны ўпор зрабіць на партыйна-масавую работу. Гэта і будзе тым самым забясьпячэньне выкананьня праміфінпляну» (Кагановіч).

Сучасны этап сацыялістычнага будаўніцтва ставіць павышаныя патрабаваньні да якасьці работы і партыйнага кіраўніцтва. Задача заключаецца ў тым, каб дабіцца далейшага паляпшэньня партыйна-масавай, палітычнай работы, узьняцьця яе на новую, больш высокую ступень.

Р. Додзін, М. Пукшанская.

РАЎНЯЦЦА ПА ПОЛАЦКУ І ДРЫСЕ!

ДА 25 КРАСАВІКА ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН КАНТРАКТАЦЫІ ІЛЬНУ І КАНАПЕЛЬ!

ВЫШЭЙ ТЭМПЫ!

За другую пяцідзеньку красавіка ў кантрактацыі ільну па БССР дасягнут некаторы пералом. Гэта пяцідзеньку дала прыросту 20 проц. рэспубліканскага пляну.

Усё-ж агульны ход кампаніі трэба прызнаць незадавальняючым.

Прааналізуем зводку Загатільну ў раённым і сэктарыяльным разрэзе.

У значнай частцы раёнаў БССР, у тым ліку і ў паасобных ільнаводчых (Бальніцкі, Чавускі) кантрактацыя ільну дагэтуль і не рушалася. У радзе раёнаў асабліва тых, дзе кантрактацыю праводзіць сыстэма Белкаапсаюзу, кампанія праходзіць маруднейшымі тэмпамі і ў наяўнасьці глыбокія прарывы. У Віцебскім раёне, напрыклад, плян выканан на 0,6 проц., Петрыкоўскім — на 2,7, Бабруйскім — на 2,7, Рагачоўскім — на 3,1, Жыткавіцкім — на 4,6, Брагінскім—на 5,2, Хойніцкім — на 5,5 проц. і г. д.

Адказасобнаму сэктару на мясцох аддаецца зусім невыстарчальная ўвага і таму ён аказаўся найбольш адсталым вучасткам кантрактацыі. Калі па калгасах, якія абслугоўваюцца МТС, плян выкананы на 42,5 проц., па іншых калгасах на 38,3 проц., — дык у адказасобным сэктары кантрактацыйныя дагавары заключаны толькі на 18,5 проц.

Прычыну гэтых нездавальняючых паказальнікаў агульнага ходу кантрактацыі па рэспубліцы трэба шукаць у палітычнай недаацэнцы важнасьці гэтай кампаніі з боку некаторых партыйных і савецкіх арганізацый, у няўменьні па-бальшавіцку арганізаваць работу, узьняць партыйны і савецкі актыў, мабілізаваць шырокія масы калгаснікаў і працоўных адпаасобнікаў на поўнае і своечасовае выкананьне кантрактацыйных плянаў.

Гэтыя пляны зусім рэальныя. Толькі безнадзейныя апартуністы, людзі, нездольныя змагацца за ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі і ўраду, могуць сьцьвярджаць аб нерэальнасьці заданьняў па кантрактацыі, немагчымасьці іх выкананьня. Ці ня лепшым доказам глыбока суб'ектыўных прычын становішча кантрактацыі ў тым ці іншым раёне зьяўляецца вопыт Полацку і Дрысы, якія паказалі сапраўды ўдарныя, сапраўды бальшавіцкія тэмпы работы. Па гэтых раёнах кантрактацыя ільнавалакна ўжо скончана, амаль на два тыдні раней вызначанага тэрміну! Фактычна Полацкі і Дрысенскі раёны правялі кантрактацыю на працягу аднэй-паўтары дэкады. Гэта сьведчыць аб тым, што посьпех кантрактацыі залежыць выключна ад якасьці работы раённых арганізацый, сельсаветаў, загатоўчых органаў.

Там, дзе раённыя арганізацыі не змагаюцца па-бальшавіцку за лён, не ўразумелі значэньня кантрактацыі для будучых ільна-загатовак, — там кампанія правальваецца, заключэньне кантрактацыйных дагавораў зрываецца. Прыкладам у гэтых адносінах служаць Чавускі, Рэчыцкі, Слуцкі, Смалявіцкі, Магілеўскі, Клімавіцкі, Быхаўскі, Церахаўскі, Пухавіцкі і рад іншых раёнаў, дзе на 10 красавіка яшчэ ня было заключана ні аднаго гэктара пасеву ільну. Прыкладам служаць Бальніцкі, Асіповіцкі і Стара-Дароскі раёны, дзе пляны кантрактацыі не даведзены яшчэ нават да сельсаветаў.

Толькі клясаваму ворагу, кулаку і яго агентуры на руку такая «работа». Кулак карыстаецца бязьдзейнасьцю раённых арганізацый і шырока разгортвае сваю шкодніцкую антысавецкую работу.

Кулацкі сябатак павінен быць зломлен. Трэба ўзьняць кантрактацыйную кампанію на высокі палітычны ўзровень, мабілізаваць усю энэргію на пасыпаховае правядзеньне яе.

Засталося 10 дзён да тэрміну скончэньня кантрактацыі, вызначанага пастановай СНК і ЦК. Галявая задача ўсіх партыйных і савецкіх арганізацый БССР — дабіцца поўнага выкананьня плянаў да гэтага тэрміну. Па прыкладу Полацкага і Дрысенскага раёнаў павінны раўняцца ўсе раёны нашай рэспублікі!

На 2 тыдні раней тэрміну

ПОЛАЦАК (Па тэлефону ад нашага карэспандэнта)

Да 12 красавіка Полацкі раён скончыў кантрактацыю ільну. Плян перавыкананы амаль на 2 тыдні раней тэрміну.

Што забясьпечыла посьпех Полачыны ў правядзеньні кантрактацыі ільну?

Па-першае,—**апэрацыйнасьць работы.** 17 сакавіка былі атрыманы пляны з Менску. Апошнія былі зараз-жа распрацаваны канторай Загатільну, зацьвярджаны РК КП(б)Б і РВК. 19 і 20 сакавіка пляны ўжо даводзіліся да сельсаветаў, калгасаў, адпаасобных паселішчаў і двароў. Тэрміновасьць работы на выклікала штампаваньня, механічнага разьмеркаваньня плянаў: **пытаньне было загадзя падрыхтавана.**

РК КП(б)Б правёў нараду старшынь сельсаветаў і сакратароў парт'ячэек па пытаньні аб кантрактацыі. Гэта пытаньне абмяркоўвалася і на пленуме РК КП(б)Б. У выніку мабілізацыі партыйнага і савецкага актыву, на мясцох разгарнулася дзелавая, практычная работа.

Важна адзначыць адзін з дадатных бакоў правядзеньня кантрактацыі ільну ў Полачыне. Перад разгортваньнем работы ў вёсках большасьць сельсаветаў загадзя вывучалі пляны сяўбы, арыентавача вызначалі колькасьць прадукцыі ільну, якую можа закантрактаваць тая ці іншая гаспадарка. На сход ішлі з выразнымі лічбамі, а не з толькі рукамі. Хто гэтага не рабіў, той займаўся гаварыльнай, а не барацьбой за лён. Прыкладам можа быць **Пакоўшчынскі** сельсавет, які выканаў плян толькі на 18 проц.

Па Полачыне павінны раўняцца ўсе іншыя раёны БССР, у прыватнасьці, суседні **Вушацкі** раён, які па 11 красавіка выканаў плян кантрактацыі толькі на 19 проц.

Мікуцкі.

За бязьдзейнасьць зьняты з работы

Загад па беларускай рэспубліканскай канторы „Загатлён"

Адзначаючы яўную бязьдзейнасьць і ігнараваньне дырэктыў ураду і беларускай рэспубліканскай канторы «Загатлён» аб кантрактацыі ільну і капапель з ураджаю 1933 году кіраўніцтвам Сіроцінскай, Талачынскай, Крупскай кантор «Загатлён» і ўпаўнаважаным «Загатлён» па Бешанковіцкім раёне, загадваю:

1. За ігнараваньне распарадкоўчых белканторы «Загатлён» і ўрадовых дырэктыў аб правядзеньні кантрактацыі, за праяўленую бязьдзейнасьць у гэтай справе, з прычыны чаго пляны па кантрактацыі яшчэ да 7-IV г. г. не даведзены да калгасаў і вёсак, загадчыка сіроцінскай канторы «Загатлён» тав. **Аксёнава** з працы зьняць і справу аб ім перадаць адпаведным органам для прыцягненьня яго да адказнасьці.

2. Упаўнаважанага «Загатлён» па Бешанковіцкім раёне тав. **Ляўковіча** зьняць з работы.

3. Загадчыку «Загатлён» Крупскага раёну тав. **Зубенку** і загадчыку талачынскай канторы «Загатлён» тав. **Засьцянчыку** абвяшчаю суровую вымову.

4. За пераэкзаменаваньне на падбайных адносіны да кантрактацыі крупскай і талачынскай кантор «Загатлён», за падачу інфармацыі аб становішчы кантрактацыі па гэтых раёнах белканторы «Загатлён», упаўнаважанаму па кантрактацыі ў гэтых раёнах, інспэктару белканторы «Загатлён» тав. **Метрыку** абвяшчаю суровую вымову з папярэджаньнем і адкліканю яго з гэтых раёнаў у распарадженьне белканторы «Загатлён», як неспасобнага выканаць кіраўніцкія разгорт ваньня работы па кантрактацыі ў гэтых раёнах.

5. Папярэджваю загадчыкаў усіх іншых кантор «Загатлён», дзе кантрактацыя праходзіць слаба, што калі ня будзе пералому ў бліжэйшыя дні, будуць прыняты да іх самыя суровыя меры пакаранньня.

Кіраўнік беларускай рэспубліканскай канторы «Загатлён» ВАЙНОВІЧ.

ПЛЯН ПЕРАВЫКАНАН

ЦК КП(б)Б, СНК БССР, Белзагатільну

ПОЛАЦАК.

НА 12 КРАСАВІКА ПА ПОЛАЦКІМ РАЁНЕ ЗАКАНТРАКТАВАНА ІЛЬНАВАЛАКНА 2.688 ЦЭНТНЭРАЎ, ШТО СКЛАДАЕ 102 ПРОЦАНТЫ ПЛЯНУ.

САКРАТАР РК КП(б)Б **АЎСЕЕНКА.**

СТАРШЫНЯ РВК **ШАБАЛТАС.**

ЗАГАДЧЫК РАЙКАНТОРЫ «ЗАГАТІЛЬНУ» **ЦІШКОЎ.**

100,1 проц.

ДРЫСА (ПА ТЭЛЕГРАФУ).

ПЛЯН КАНТРАКТАЦЫІ ІЛЬНУ ПА ДРЫСЕНСКІМ РАЁНЕ ВЫКАНАН НА 100,1 ПРОЦ.

М.

вішь пытаньне аб ракавіне ўлады пралетарыятам. Мы, германскія камуністы, ня мелі, як рускія бальшавікі ў кастрычніку 1917 г., на сваім баку пераважнай большасьці ня толькі працоўных, але нават пралетарыяту. Значная частка сялянства і гарадзкая дробная буржуазія ня ежылі яшчэ сваіх ілюзій у адносінах нацыяналізму. Уся ўзброеная сіла—рэйхсвар, паліцыя, Сталёны шлем, штурмовыя атрады — процістаяла абазброенаму пралетарыяту. А рускія бальшавікі, як вядома, мелі за сабой ня толькі ўзброеных рабочых, але і значную частку арміі пры спрыяючым нейтралітэце другой часткі арміі.

Гэта расстаноўка клясавых сіл вырасьліла сабою часовае паражэньне пралетарыяту.

Ці азначае гэта канец рэвалюцыйнага ўздыму ў Германіі, канец высьпяваньня рэвалюцыйнага крызісу ў ёй?

Не, не азначае.

Ня глядзячы на жудасны фашысцкі тэрор, германскі пралетарыят яшчэ ня бяўся як належыць з буржуазіяй. Ён не капітулякаў і не капітулюе перад фашызмам, ня глядзячы на мораль ны заняпад і здраду Вальсаў і Лейпартаў, якія капітулявалі і здаліся на ліквідацыю Гітлера. Германскі пралетарыят вядзе ў сотнях месц частковую барацьбу за свае пакуль і свае арганізацыі. Разам з тым рабочая клясе Германіі трапіла клясавую стойкасьць, выпрыманасьць і манэўранасьць, неабходныя для таго, каб пераскор усім провакацыям і адрадніцтвам ня ўвязацца ў рашучую схватку ў абстаноўцы, выгодай ворагу.

Што датычыць камуністычнай партыі, яна не дапусьціла і не дапусьціць сваёй ізаляцыі ад мас, ня глядзячы на тэрор і праваляцыі Гітлера —Герынга. Ніколі яшчэ германская кампартыя ня мела такой маральнай вагі сярод рабочых мас, як зараз, калі сацыял-дэмакратычныя правадыры падтрымоўваюць боты Гітлера, а камуністы разгортваюць сьцяг непрымірымай барацьбы супроць фашызму. Гітлеры аб тым, што германская кампартыя нібыта раздушана і забіта паліцыяй,—ёсьць фільістэрская балбатня пустых і цёмных людзей. Ніхто ня можа раздушыць і забіць рабочую партыю, калі яна сама не забе сябе сваёй няправільнай антырэвалюцыйнай палітыкай. Сацыял-дэмакратыя зьнішчана як партыя не таму, што Гітлер аказаўся мацнейшым. Сацыял-дэмакратыя зьнішчана таму, што яна сама забла сабе маральна і палітычна, калі яна адмовілася ад барацьбы з фашызмам, калі яна капітулявала перад фашызмам, калі яна згадзілася перайсьці да яго на службу. Кампартыя моцная і непераможная таму, што яна ніколі не адступала і не адступіць ад сваіх рэвалюцыйных пазыцый, яна не капітулявала і не капітулюе перад ворагамі пралетарыяту і іх крывавай агентурай—фашызмам, яна ўвесь час трымала і будзе трымаць у сваіх руках сьцяг непрымірымай барацьбы супроць фашызму. Гітлым імёнам і тлумачыцца, што кампартыя ня вядае таго маральнага маразму і палітычнага ўнадніцтва, якія разьдаюць цяпер сацыял-дэмакратыю. Гэтыя-жа трэба тлумачыць той факт, што кампартыя Германіі ніколі яшчэ не карысталася такім вялікарным маральным аўтарытэтам, якім яна карыстаецца цяпер сярод мільённых мас пралетарыяту Германіі, якія яе хочуць мірыцца з крывавым фашызмам.

Вось чаму я думаю, што цяперашняе становішча германскай буржуазіі шматкроднае, што пралетарская рэвалюцыя ў Германіі пачне перамагчы, што фашызм павінен быць і будзе разьбіт у Германіі.

Толькі дурні могуць думаць, што буржуазіі за ўмовах цяперашняга крызісу ўдалося стварыць моцную гегемонію над сялянствам і гарадзкой дробнай буржуазіяй на рад год. Крывавыя перыпэтыі, падобныя на цяперашняга перыпэтыі ў Германіі, характарызуюцца ... ціні і тыдні замяняюць тоды і дзесяцігодзьдзі зьвычайных, нармальных часоў. Хто апраўдывае сьцьвярджаць, што ў Германіі наступіў суцэльны эканамічны аблягчэньне і што буржуазіі ўдалося выправіць унутраныя і знадворныя супярэчнасьці германскага капіталізму? Ліквідаваць беспрацоўе, абазначыць надзвычай цяжкое становішча рабочых, прыпыніць руйнаваньне сялянства і гарадзкой дробнай буржуазіі, пусьціць у ход заводы і фабрыкі, забясьпечыць устойлівасьць германскай валюты, заваяваць неабходныя для германскай прамысловасьці заморскія рынкі, пакончыць з Версальскім ... і ... ніякіх ... ні адной з гэтых задач фашысцкі ўрад выправіць ня ў стане. Тое, што адбываецца ў Германіі,—гота кампрэсіі капіталізму, а не яго «стабілізацыя».

Толькі дробны буржуа мог думаць, што плян германскай рэвалюцыі будзе ісьці ад адной выбарчай перамогі кампартыі да другой, без таго, што буржуазія, навучаная ўрокамі Кастрыніцкай рускай рэвалюцыі, ня будзе шалёна супраціўляцца пралетарскай рэвалюцыі. І так будзе ня толькі ў Германіі, а ва ўсіх капіталістычных краінах, калі будзе паўставаць на ўпор пытаньне аб уладзе. Да заваяваньня большасьці рабочае клясы кампартыі ідуць і будуць ісьці з крывавымі баямі.

II. ПЭРСПЭКТЫВЫ ФАШЫСЦКАЙ ДЫКТАТУРЫ

Якавы перспэктывы германскага фашызму?

Крушэньне фашысцкага рэжыму ў Германіі залежыць перш за ўсё ад згуртаваньня пралетарыяту як клясы шляхам заваяваньня германскай кампартыяй большасьці яго на свой бок і ліквідацыі ўплыву рэакцыйнай сацыял-дэмакратыі, вёрнай да гэтага часу большасьці пралетарыяту за сабой. Толькі згуртаваньне пралетарыяту, як рэвалюцыйнай клясавай сілы, паскорыць працесы адыходу ад фашызму тых пластоў сялянства і гарадзкой дробнай буржуазіі, якія ішлі да гэтага часу за ім. Абодвы гэтыя моманты, якіх ўплываюць адзін на другога і павышаюць баявую актыўнасьць мас, пацягнуць за сабой, з аднаго боку, крызіс «вярхоў» у радах буржуазіі, з другога боку, разлажэньне нізавога фашысцкага апарату тэрарыстычнай дыктатуры.

У галіне эканамічнай фашызм выступуў прыпыніць капіталістычнай аўтаркіі. Але, не гаворачы ўжо аб тым, што капіталістычная аўтарнія ёсьць эканамічная нераўнасьць, германскі капіталізм з яго фашысцкай палітычнай аўтаркіі, якая пруцуецца на жорсткім кантынгентаваньні ўвозу, стаіць перад дылемай навыкрашчаных і ўнутрана-супярэчлівымі задачамі: перад неабходнасьцю, па-першае, стварэньня больш ёмістага ўнутранага рынку, па-другое, фарсаваньня экспарту. Але як можа фашысцкі рэжым на заработнай платы зьменшыўся за гады крызісу на палову, калі ўвесь соцыяльскай гаспадаркі, ня гледзячы на ўзьдзеньне мыт і субсыдый, зьнізіўся за апошнія пры гады болей чым на 30 проц., калі масавыя банкруцтвы аграбяюць мільёны дробных уладальнікаў, калі, нарэшце, 2/3 выпорчага апарату бязьдзейнічаюць? Жорсткае кантынгентаваньне ў міжнародным гандлі ня толькі мае на мэце для кожнай капіталістычнай краіны сьцісканьне імпарту, але і выклікае абмежаваньне экспарту. Германская буржуазія ні можа разьлічваць на тое, што ёй дазволяць закрыць свой унутраны рынак для імпарту і адначасова захаваць або пашырыць свой прамысловы экспарт. А скарачэньне экспарту ставіць пад пагрозу германскую марку. Ужо зараз залаты запас у Германіі вымяшыўся, паводле заявы Шахта, з 3,3 млн. марак у дзевяць раз. Рэзкае зьмяншэньне актыўнага гандлёвага балянсу ў Германіі за гады крызісу амаль з 3 млрд. марак да 1 млрд. дэпрэцыюе бязупынны і рэзкі працэс зьнішчэньня германскага экспарту. У сту дзені і лютым германскі экспарт зьменшыўся ў вогуле на одну чвэрцку параўнальна з сярэдні-месячным узроўнем мінулага году. Пагроза «стабільнасьці» германскай маркі стаяе ... ...

Фашызацыя прафсаюзаў Германіі

БЭРЛІН, 13. Новая кіраўніцтва (нацыянал-сацыяліст Мальцаў і дэпутат рэйхстагу Штэр) так званага нацыянальнага прафсаюзу гандлёвых служачых, які налічвае каля 400 тысяч членаў, пастанавіла спыніць сувязь з каталіцкімі прафсаюзамі, з якімі гэты прафсаюз быў звязан.

«Тэглісэ рундшау» падкрэслівае, што гэтай рэарганізацыяй прафсаюзу гандлёвых служачых пакладзен пачатак стварэння адзінага прафсаюзу служачых пад кіраўніцтвам нацыянал-сацыялістаў.

Фармальна ініцыятыву стварэння гэтага адзінага прафсаюзу ўзяло на сябе аб'яднанне «дэмакратычных» прафсаюзаў служачых, «Гэзэльшафтбунд дэр Ангештэльтэн», якое перадало ўчора ўраду праект «уніфікацыі» германскага прафруху.

Праект прадугледжвае аб'яднанне ўсіх германскіх прафсаюзаў у тым ліку і рэфармісцкіх, бо «у новай дзяржаве няма необходнасці ў існаванні трох розных па светапогляду прафсаюзных аб'яднанняў».

Праектуецца таксама аб'яднанне рабочых прафсаюзаў, прычым абодва аб'яднанні разам стваралоць «саюз нацыянальных прафсаюзаў». Задача саюзу, паводле праекту, будзе заключацца ў супрацоўніцтве з арганізацыямі прадпрыемцаў.

Мяркуючы па мэтаду «рэарганізацыі» прафсаюзу гандлёвых служачых і па выказваньнях некаторых вядомых нацыянал-сацыялістаў, фашызацыя прафсаюзаў будзе ў асноўным праводзіцца не шляхам роспуску існуючых прафсаюзаў, а шляхам захопу нацыянал-сацыялістамі кіраўніцтва ў прафсаюзах.

Намесьнікі прыступаюць да работы

Назначэньне ўраду ў Баварыі

БЭРЛІН, 13. (БЕЛТА). Новы намесьнік Баварыі генерал **Офп** назначыў баварскага камісарнага міністра фінансаў **Зібэрта** прэм'ерам Баварыі. Зібэрт захавае за сабой таксама партфэль міністра фінансаў. Увесь габінэт складаецца выключна з нацыянал-сацыялістаў.

Учора новапрызначаны габінэт пастанавіў ліквідаваць баварскае міністэрства замежных спраў і замест яго стварыць «дзяржаўную канцылярыю» Баварыі, начальнікам якой прызначан **Эсэн**.

Германія—у ніскох фашызму

БЭРЛІН, 13. Як паведамляюць газэты, надзвычайны суд у Касэлі прысудзіў аднаго абвінавачанага ў нападзе на нацыянал-сацыялістаў да 6 год турмы і да пазбаўленьня грамадзянскіх правоў на 4 гады, другога—да 3-х год турмы і 5-гадовага пазбаўленьня грамадзянскіх правоў. Астатніх—да 18-ці месяцаў арышту кожнага.

Надзвычайны суд у Бэрліне прысудзіў рабочага да 8-мі месяцаў турмы. Матыў—нібы ён расказаў, што бачыў, як нацыянал-сацыялісты вырвалі ў ота рога яўрэя бараду.

2 работніцы, якія абвінавачваліся ў пашырэньні антыфашысцкіх лістовак, прысуджаны да 6-ці месяцаў арышту кожная.

Сёньня асобныя атрады палітычнай паліцыі ў Бэрліне з дапамогаю штурмовых і асобных атрадаў зрабілі абыход ў пасёлку саюзу «Прыяцеляў саду». У вобласьці прымала ўдзел звыш 800 чалавек. Праведзена шмат арыштаў.

У Эрфурце арыштаваны 2 актывісты кампартыі. У Гэсэнгене зроблены вобыскі на кватэрах камуністаў. Арыштаваны 3 чалавекі. У Цэлерфэльдзе мелі месца буйныя паліцэйскія аблавы. Арыштавана некалькі чалавек.

У працоўным лягеры младагерманскага органу у Гелінбэку (правінцыя Шлезьвіг) паліцыя зрабіла вобыск, кан фіскаваўшы некалькі штук агнястрэльнай зброі і кінжалаў. Людзі, якія знаходзіліся ў лягеры, былі арыштаваны.

Сёньня ўначы вартаўнікі аэрадрому ў Бэрліне былі абстраляны невядомымі асобамі. Цяжка паранен паліцэйскі вахмістр. Страляўшыя, нявыяўлены. Сёньня ноччу на шашы Бэрлін-Шпандау абстрэлялі двух штурмавікоў.

Забарона органа Людэндорфа

БЭРЛІН, 12 (БелТА). Забаронена на месяц орган Людэндорфа «**Фольковарт**». Забарона матывуецца «зьдзекамі з канцлера і прэзыдэнта», дапушчанымі ў паведамленьні газэты аб адарыцыі рэйхстагу.

Баўгарскі парлямант анулявоў мандаты рабочай партыі

ВЕНА, 12. (БЕЛТА) Як паведамляюць з **Сафіі**, сабраньне (парлямант) прыняла закон аб пазбаўленьні ўсіх дэпутатаў рабочай партыі іх мандатаў. Ануляваньне мандатаў рабочай партыі матывуецца тым, што «рабочая партыя расгарнула антыдзяржаўную дзейнасьць і вяла работу па разбурэньні армеі». Паводле закону замена ануляваных мандатаў, ці частковыя перавыбары, ня будуць мець месца. Пытаньне-ж аб роспуску рабочай партыі перадана для вырашэньня канстытуцыйнаму суду.

Каб стварыць трывожную атмасфэру, у часе правядзеньня законаў у парлямэнце адбылося паралельнае пасяджэньне вярхоўнага ваеннага савету, на якім абмяркоўвалася пытаньне «камуністычнай небясьпекі ў радох баўгарскай армеі». Ваенны міністар, генэрал **Кісноў**, заявіў, што «для барацьбы супроць рэвалюцыйнага рабочага руху мала раскрыць камуністычныя ячэйкі ў радох армеі,—як гэта рабілася ў гарнізонах **Арэхава, Нікапалі і Казанліку** і ануляваць мандаты рабочай партыі,—а неабходна дабіцца роспуску рабочай партыі».

Сьмяротныя прыгаворы і катаржныя прысуды не спыняюцца

ВІЛЬНЯ. Віленская прэса паведамляе аб новых сьмяротных прыгаворах і катаржных прысудах над рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі ў Польшчы.

Гэтымі днямі ў **Перамысьлі** адбыўся ваенна-палявы суд над **Страхам** Міхасём, **Зёнткам** Міхасём і **Дырдатам** Уладыславам па абвінавачваньні ў нападзе на паменчыка.

Ваенна-палявы суд прыгаварыў **Страха** Міхася і **Дырдата** Уладыслава **да кары смерцю праз павешаньне. Зёнтака Міхася—на бястэрміновую каргу.**

Прэзыдэнт рэспублікі адхіліў просьбу аб памілаваньні, паданую ад імя абаронцаў. Прыгавор выкананы.

У **Вільні** акруговы суд разглядаў справу **Ігната Ягелы** 32-х год, жыхара **Вільні, і Балеслава Сухарскага**—30 год, жыхара мястэчка **Нова-Вілейка**, якія абвінавачваліся ў моцным заразе у Польшчы шпіёнажы. Суд адбываўся пры зачыненых дзьвярах.

Акруговы суд прыгаварыў: **Сухарскага на 8 год катаргі** з пазбаўленьнем правоў на 10 год. **Ягелу Ігната на 10 месяцаў катаргі.**

9 красавіка адбыўся палітычны працэс над трыма маладымі рабочымі. На лаве падсудных знаходзіліся — **Лея Гольдбэрг—17 год, Іта Рапаль**—18 год, **Вольф і Дытман** Усе трое абвінавачваліся ва ўдзеле ў дэманстрацыі, якая адбылася ў жніўні 1932 г.

Суд прыгаварыў **Гольдбэрг Лею і Рапаль Іту да 3 год катаргі кожную, Дытмана—на 1 год.**

Эйнштэйн на чале катэдры „Коледж-дэ-франс"

ПАРЫЖ, 13 (Белта). Палата дэпутатаў аднагалосна прыняла прапанову міністра асьветы **Дэ-Монзі** аб адкрыцьці пры «Коледж дэ-Франс» катэдры па фізыцы і матэматыцы, на чале якой будзе прафэсар Эйнштэйн.

Чым выклікана некаторае аслабленьне ў праследваньні яўрэяў

ЛЁНДАН, 12. Карэспандэнт «Дэйлі Геральд» тлумачыць некаторае аслабленьне праследваньня яўрэяў у Германіі прабываньнем у Бэрліне Дэвіса, які ў акресьленых выразах заявіў Гітлеру і Нейрату, што «міжнародны пазор» робіць сумнае ўражаньне на амэрыканскую грамадзкую думку і кіруючыя колы. Паводле слоў карэспандэнта, Дэвіс даў зразумець, што кіруючыя фінансісты ПАЗНІ, якія да гэтага часу спрыяльна адносіліся да Германіі, катэгарычна адмовіцца дапамагаць Германіі, калі праследваньне яўрэяў будзе працягвацца.

ПАСТАНОВА САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ І ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ УсеКП(б)

З прычыны таго, што існуючая практыка скліканьня ў раённых цэнтрах, МТС і праўленьнях калгасаў доўгіх нарад у вячэрні і начны час выклікае спазьненьне выхаду кіруючых работнікаў раёну, МТС і калгасаў на работу ўрашку, і тым самым аслабляецца кіраўніцтва работы ў полі, Савет Народных Камісараў Саюзу ССР і Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) **пастанаўляюць:**

1. Забараніць на час пасеўнай кампаніі правядзеньне якіх-бы там ні было нарад пазьней 10 гадзін вечара з удзелам брыгадзіраў, старшынь калгасаў і іншых кіруючых работнікаў сельска-гаспадарчай вытворчасьці.

2. Абавязаць раённых работнікаў, дырэктароў МТС, старшынь калгасаў, калгасных брыгадзіраў і аграномаў пачынаць работу за гадзіну да выхаду сялян у поле з тым, каб забясьпечыць пачатак работы палявых брыгад поўнасьцю ў звычайны ў сялянскай практыцы час—са сьвіданьнем.

Старшыня Савету Народных Камісараў Саюзу ССР—
В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).

Сакратар Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б) — І. СТАЛІН.

Швэдзкая газэта аб англа-савецкім канфлікце

СТАКГОЛЬМ, 13. (Белта). Орган швэдзкіх гандлёвых колаў «**Гэтэборгс Хаандэлсок Шэфартс Тыднінг**» зьмяшчае артыкул свайго лёндонскага карэспандэнта па пытаньні аб пагрозе забароны імпарту савецкіх тавараў у Англію. Карэспандэнт піша, што за хады супроць савецкага імпарту—«над война вострая зброя, што ангельскія фірмы і ангельскія спажыўцы шмат трацяць ад забароны прывозу савецкіх тавараў.

Аналізуючы далей характар англа-савецкага канфлікту, карэспандэнт указвае, **што СССР лёгка можа замяніць ангельскі імпарт імпартам іншым краінам.** Забарона-ж савецкага ўвозу ў Англію нявыгодна для ангельскіх фірм і спажыўцоў, бо яна прыводзе да павышэньня цэны на лес, а многія машына-будаўнічыя заводы зарыхтоўваюць крыюцца, у выніку страты савецкіх заказаў.

Карэспандэнт лічыць, што пагроза забароны ўвозу савецкіх тавараў у Англію зьяўляецца не вынікам арышту ангельскіх інжынэраў у Маскве, а вынікам пратэкцыянісцкай палітыкі Англіі, якая выявілася ў аттаўскіх згодах.

Чыстка вышэйшых навуковых установаў

БЭРЛІН, 13 (Белта). Згодна паведамленьня вячэрніх газэт, прускі міністар народнай асьветы Рust у нарадку «уніфікацыі вышэйшых навуковых установаў» звольніў у водпуск 15 прафэсароў, у тым ліку Бонна (Берлін), Лендэра (Берлін), Кэлера, Кантаровіча (Кёльн), Мангейма, Гольдгеймэра, Фойлера і інш.

„АНГЛІЯ НЯ МАЕ ПАДСТАВЫ ПРАТЭСТАВАЦЬ СУПРОЦЬ ДЗЕЯНЬНЯЎ САВЕЦКАГА СУДА"

„Джапан Таймс" аб справе шкоднікаў на электрастанцыях

ТОКІЁ, 12. Камэнтуючы працэс ангельскіх інжынэраў, «**Джапан Таймс**» піша: «Паколькі Англія прызнае СССР і ангельцы не карыстаюцца ў СССР правамі экстэрытарыяльнасьці, Англія з пункту гледжаньня юрыдычнага таксама ня мае падставы пратэставаць супроць дзеяньняў савецкага суда, як і СССР ня можа пратэставаць супроць судаводзтва ў адносінах савецкіх грамадзян у Англіі. На ўказаньне, што ангельскія інжынэры абвінавачваюцца ў дзеяньнях, якія ня лічацца злачынствам у іншых краінах, СССР можа ўказаць на дзеяньні, якія лічацца заграніцай злачынствам, але ня лічацца злачынствам у СССР, напрыклад, папярэдняе камуністычных ідэй». Газэта падкрэсьлівае, што ў справе ангельскіх інжынэраў непадрэзумоўны абумоўлены на спосыл прававымі меркаваньнямі, колькі нас троімі, якія вызначаюць адносіны паміж СССР і Англіяй. Газэта нагадвае як у свой час цьвёрдалобыя абвінавачвалі Японію ў тым, што японскія суды вырашаюць спрэчнае пытаньне паміж чужаземцамі і японцамі заўсёды па карысьць апошніх. Далей газэта ўказвае, што «няма ніякіх даных, каб савецкія судовыя органы адносіліся да гэтага часу да ангельскіх інжынэраў больш сурова, чым да савецкіх грамадзян у падобных умовах».

Балючы ўдар па замежным гандлі Японіі

Скасаваньне япона-індыйскага гандлёвага дагавору

ТОКІЁ, 13. (БелТА). Скасаваньне япона-індыйскага гандлёвага дагавору — у цэнтры ўвагі друку. У эканамічных колах вельмі заклапочаны нямінучым пагоршаньнем японскага гандлю з Індыяй. Удар тым больш адчувальны, што Індыя пасьля страты значнай часткі кітайскага рынку займае ў замежным гандлі Японіі другое месца, уступаючы толькі Амэрыцы.

***

ТОКІЁ, 13. Апублікавана заява міністра фінансаў **Такахасі** аб уходзе ў адстаўку. У колах Сойюкая лічаць, што адстаўка Такахасі нямінуча пацягне за сабой адстаўку ўсяго габінэту **Саіта.**

Забастоўкі працягваюцца

ВАРШАВА, 13. (БелТА). З Лодзінскага раёну паведамляюць, што, ня гледзячы на здрадніцкі зрыў прафбюракратамі ўсеагульнай забастоўкі, забастовачная настрой сярод рабочых гэтага буйнага асяродку адчуваецца вельмі моцна. 12 красавіка выбухнула забастоўка 4-х тысяч рабочых фабрыкі штучнага шоўку ў **Тамашове** ў адказ на спробы дырэкцыі зрэзаць зарплату. У **Беластоку** ўсеагульная забастоўка тэкстыльшчыкаў працягваецца, пры чым у апошнія дні сітуацыя значна абвастрылася, у выніку зрыву перагавораў паміж прамысловцамі і рабочымі. Рабочыя мэталюргічнага заводу «Мілоніце» у **Сасноўцы**, у ліку 600 чалавек пачалі ўчора забастоўку, патрабуючы выплаты затрыманай зарплаты. Бастуюць таксама гарнякі капальні «Елена» ў **Дамброве.**

Пра сярэднія нормы ўраджайнасьці на 1933 г.

Пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР

ЦК КП(б)Б і Савет Народных Камісараў БССР у зьмену пастановы СНК за 14 сьнежня 1932 г. № 612 пастанаўляюць устанавіць наступныя сярэднія нормы ўраджайнасьці на 1933 г. (у цэнтнэрах а 1 га) па асобных раёнах:

Назва раёнаў	Па зоолжаных	Ільнавалакне	Бульбе	Увага
ІЛЬНАМАЛОЧНЫЯ РАЁНЫ				
Дрыгенскі	8,5	2,5	90	
Полацкі	8,5	2,4	90	
Лепельскі	7,5	2,4	90	
Асьвейскі	8,5	2,4	90	
Расонскі	8,2	2,4	90	
Вушацкі	8,5	2,4	90	
Сіроцінскі	8,8	2,4	95	
Бешанковіцкі	8,8	2,5	95	
Чашніцкі	7,5	2,4	90	
Крупскі	8,0	2,4	100	
Гарадоцкі	7,5	2,4	90	
Суражскі	8,5	2,6	90	
Лёзьнянскі	9,0	2,6	100	
Оршанскі	8,5	2,4	95	
Талачынскі	8,8	2,5	105	
Бялыніцкі	8,5	2,4	105	
Дубровенскі	8,5	2,6	100	
Горацкі	9,9	2,6	100	
Мсьціслаўскі	9,0	2,6	105	
Чаўскі	8,5	2,5	100	
Шкалоўскі	8,5	2,6	105	
II ЖЫВЕЛАГАДОЎЧА-БУЛЬБЯНЫЯ РАЁНЫ				
Бягомльскі	7,5	2,3	90	
Плешчаніцкі	7,5	2,3	100	
Лагойскі	8,5	2,4	110	
Заслаўскі	9,8	2,4	110	
Дзяржынскі	9,0	2,4	110	
Вузьдзенскі	8,0	2,4	100	
Капыльскі	9,0	2,5	110	
Слуцкі	9,0	2,5	110	
Чырв.-Слабодзкі	9,0	2,5	110	
Борысаўскі	8,5	2,4	105	
Смалявіцкі	9,0	2,4	110	
Пухавіцкі	8,5	2,4	110	
Чэрвеньскі	8,5	2,4	105	
Барэзінскі	8,5	2,4	110	
Клічаўскі	8,5	2,4	105	
Асіпавіцкі	8,0	2,4	110	
Стара-Дарожскі	7,5	2,3	100	
Быхаўскі	8,5	2,4	100	
Прапойскі	7,5	2,4	100	
Чэрыкаўскі	8,0	2,4	100	
Кіраўскі	8,8	2,4	105	
Клімавіцкі	8,5	2,4	105	
Касьцюковіцкі	8,5	2,4	105	
Чырвонапольскі	7,5	2,4	105	
Кармінскі	8,0	2,4	100	
Рагачоўскі	8,0	2,4	105	
Жлобінскі	7,5	2,3	100	
Буда-Кошалёўскі	8,5	2,4	110	
Уваравіцкі	8,5	2,4	110	
Веткаўскі	7,5	2,3	100	
Чачэрскі	7,5	2,3	105	
Церахаўскі	8,0	2,4	105	
III. ЖЫВЕЛАГАДОЎЧА-КАНАПЛЯВОДЧЫЯ РАЁНЫ				
Старобінскі	8,5	2,4	100	
Любанскі	8,0	2,4	100	
Жыткавіцкі	7,0	2,3	95	
Тураўскі	8,0	2,4	95	
Лельчыцкі	6,8	2,3	95	
Мазырскі	7,0	2,3	95	
Пінскі	7,5	2,3	95	
Глускі	7,5	2,3	100	
Петрыкаўскі	6,8	2,3	95	
Ельскі	6,8	2,3	95	
Наваўлянскі	6,8	2,3	95	
Рэчыцкі	7,5	2,3	105	
Лоеўскі	7,0	2,4	100	
Брагінскі	8,8	2,4	110	
Камарынскі	6,8	2,3	100	
Хойніцкі	9,0	2,4	110	
IV. САДОВА-ГАРОДНІЯ МАЛОЧНЫЯ РАЁНЫ				
Менскі	9,0	2,4	115	
Бабруйскі	7,8	2,4	115	
Гомельскі	8,0	2,4	115	
Магілёўскі	8,5	2,5	115	
Аршанскі	8,8	2,5	115	
Віцебскі	8,8	2,5	115	
Сярэдняя па БССР	**8**	**2,4**	**100**	

Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.
Старшыня СНК БССР
М. ГАЛАДЗЕД.

14 красавіка 1933 г.
г. Менск.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Падрыхтоўка да 1 мая

Наркамат лёгкай прамысловасьці БССР адзначае першамайскае сьвята пускам новых прадпрыемстваў і культурна-бытавых устаноў. У Менску канчаецца РЭКАНСТРУКЦЫЯ ГУТЫ «ПРАЛЕТАРЫ». Пабудаваны новая ванная печ, галоўны корпус і г. д.

Падрыхтоўваецца пуск да 1-га мая НОВАГА ЗАВОДУ БУЙНА-БЛЁЧНЫХ КАМЕНЬНЯЎ У МЕНСКУ з прадукцыйнасьцю ў 60.000 каменьняў у год.

У эксплёатацыю здаецца 114 КВАТЭР, пабудаваных пры фабрыках імя Клары Цэткін, «КІМ», «Дубровенская мануфактура», для спэцыялістаў і работнікаў навукова-дасьледчага інстытуту прамысловасьці.

Пры Беларускай дзяржаўнай бібліятэцы і бібліяграфічным інстытуце адкрываецца ВЯЛІКАЯ КНІЖНА-МАСТАЦКАЯ ВЫСТАЎКА з пяці аддзелаў, прысьвечаная 1-му мая.

Музэй Рэвалюцыі БССР рыхтуе ТРЫ ВЫСТАЎКІ — адну пастаянную і дзьве перасовачныя на тэму «1-га мая — сьвята сусьветнага пралетарыяту» Выстаўкі-перасоўскі абслужаць буйнейшыя прадпрыемствы, калгасы і саўгасы. Да 1-га мая ў музэі адкрываецца новы аддзел «Кастрычнік».

У адзнаку 1-га мая і 4-й гадавіны сацыпаборніцтва на менскай абутковай фабрыцы АРГАНІЗУЮЦЦА НОВЫЯ ГАСПАДАРЧА - РАЗРАХУНКОВЫЯ БРЫГАДЫ.

ЦВК СССР прэміяваў чатырох старшынь сельсаветаў БССР

Прэзыдыум ЦВК СССР прэміяваў 4-х старшынь сельсаветаў БССР за добрае правядзеньне палітычна-гаспадарчых кампаній і ўзорную арганізацыю работы сельсаветаў:

Старшыню Калышанскага сельсавету, Лёзьнянскага раёну, тав. **Новікава** — граматай і грашовай прэміяй у 300 руб.

Старшыню Баярскага сельсавету, Полацкага раёну, тав. **Ступава** — граматай прэзыдыуму ЦВК СССР і грашовай прэміяй у 400 рублёў.

Старшыню Панізоўскага сельсавету, Аршанскага раёну, тав. **Гурскага** — граматай і грашовай прэміяй у 200 рублёў.

Старшыню Жартайскага сельсавету, Барысаўскага раёну, тав. **Паўлаўца**—граматай і грашовай прэміяй у 200 рублёў.

ЦВК БССР, у сувязі з прэміяваньнем старшынь сельсаветаў, прапанаваў прэзыдыумам РВК Полацкага, Лёзьнянскага, Аршанскага і Барысаўскага раёнаў арганізаваць сацпаборніцтва сельсаветаў на лепшую падрыхтоўку і правядзеньне веснавой пасеўнай кампаніі на аснове вопыту перадавых сельсаветаў. **(Белта).**

Латыскія пісьменьнікі ў Менску

Брыгада латыскіх пісьменьнікаў, якая цяпер знаходзіцца ў Менску, 17 красавіка выедзе ў Віцебск.

Пісьменьнікі наведалі новабудоўлі—Дом Друку, Акадэмію Навук, а таксама клінічны гарадок і рад іншых устаноў. 11 і 12 красавіка госьці пабывалі ў яўрэйскім і беларускіх тэатрах.

Да ад'езду латыскія пісьменьнікі наведваюць яшчэ рад фабрык, заводаў і культурных устаноў.

Латыскія пісьменьнікі прымуць удзел у рабоце ўсебеларускай канферэнцыі драматургаў, якая адкрываецца 15 красавіка ў Менску.

16 красавіка арганізуецца вялікі інтэрнацыянальны вечар.

ПАХАВАНЬНЕ ПРАФЭСАРА Я. П. ГРОМЭРА

Учора 14-га красавіка а 2-й гадзіне дня адбылося пахаваньне прафэсара Громэра. З трупа праф. Я. П. Громэра па просьбе пазбуўных арганізацый Нерасмахоўны адгадуўся БССР зраблі ўсяго для вывучэньня мозг і залозы ўнутранай сакрэцыі. Труп прафэсара Я. П. Громэра падвергнуць сэкцыі ў анатамічным інстытуце БДУ і вуцна з прагнозам перадаецца для захаваньня ў фізыка-тэхнічны інстытут Акадэміі, у якім у апошнія часы праводзіў сваю работу пакойны.

Камісія па пахаваньні.

Паведамленьне

ПК ЦКК КП(б)Б просіць **Козеля Я. А., Батуры Яна Платонава, Макарэнка А., Дарашкевіч А. і Абраменка А. І.** (Аршанскай арганізацыі) і **Бясьсьмертнага Андрэя Антонава** (Жыткавіцкай арганізацыі) зьявіцца у ПК ЦКК КП(б)Б, або паведаміць сваё ідрэсу і месца жыхарства і работы (Менск, Савецкая 55, 3 паверх, 18 пакой).

Просьба да ўсіх партарганізацый,ведамчых месца знаходжаньня пералічаных т. т. паведаміць ПК ЦКК КП(б)Б.

Сакратар ПК ЦКК КП(б)Б
СУХАНАВА.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

У сувязі з невыстарчальнай падрыхтаванасьцю раёну да правядзеньня сяўбы, і пачаткам з 15 красавіка масавага выхаду ў поле калгасьнікаў, працоўных аднаасобнікаў, што патрабуе каб усе работнікі былі на сваіх мясцох, Бюро ГК КП(б)Б **ПАСТАНАЎЛЯЕ:**

ПЕРАНЕСЬЦІ ПЛЕНУМ ГК

на канец красавіка м-ца, лічачы цэнтральнай задачай забесьпячэньне масавага выхаду ў поле калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў, і безагаворачнае выкананьне пасеву 11.000 гэктараў аўса па Менскім раёне да 25 красавіка, паводле пастановы ЦК і СНК БССР.

Сакратар МенГК КП(б)Б КУДЗЕЛЬКА

18 красавіка, у 7 г. веч., культпроп ГК КП(б)Б

склікае

НАРАДУ КАМУНІСТАЎ ПАЛЯКАЎ гор. Менску.

Нарада адбудзецца ў польскім клюбе імя Розы Люксэмбург (рог вул. Карла Маркса і Урыцкага). Яўка ўсіх камуністаў абавязковая.

Культпроп ГК.

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА № 6

Менскага Гарадзкога Савету Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў

31 сакавіка 1933 г. *г. Менск*

Менскі Гарадзкі Савет Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў **ПАСТАНАЎЛЯЕ:**

1. Зацьвердзіць правілы адкрыцьця, пераводу і ўтрыманьня гасьцініц, заезджых дамоў, пастаялых двароў, мэблевых пакояў, цырульень, лазьняў, хлебапякарань, булачных, кандытарскіх, асабозаў, гандлёвых пляцоў і складаў, сталовак, рэстаранаў, піўных, чайных, харчовых крам, прадпрыемстваў, вырабляючых прахладзіцельныя напіткі і прадпрыемстваў прамысловага тыпу, вырабляючых харчовыя прадукты.

УВАГА: Правілы пабываюцца ў інспэкцыі аховы здароўя.

2. Абавязаць кожнае памянёнае ў п. 1 прадпрыемства:

а) для адкрыцьця або пераводу ў іншае памяшканьне атрымаць дазвол ад саннагляду на права адкрыцьця і пераводу;

б) выконваць патрабаваньні саннагляду наконт спраўленьня, або рамонту займаемага памяшканьня ў адпаведнасьці з патрабаваньнямі санітарыі;

в) мець санітарную кніжку ўстаноўленага саннаглядам узору, якую прад'яўляць саннагляду, або міліцыі па запатрабаваньні апошніх (санітарная кніжка адначасова зьяўляецца дазволам для адкрыцьця;

г) ня прымаць на працу асоб, не прайшоўшых папярэдняга медагляду;

д) не дапускаць да працы асоб, хварэючых сухотамі ў адкрытай форме, скурна-венэрычнымі і іншымі заразьлівымі хваробамі;

е) хаваць у спраўнасьці ўсе карткі асоб, якія зьяўляюцца на медагляд, і прад'яўляць іх па патрабаваньні саннагляду і міліцыі;

ж) на відным месцы вывесіць правілы ў частцы, якая датычыць данага прадпрыемства.

3. Усе працуючыя ў вышэйпамянёных прадпрыемствах у часе працы павінны быць апраўнуты ў належную спэцвопратку, устаноўленую саннаглядам, і рэгулярна зьяўляцца на менш аднаго разу ў месяц на медагляд.

УВАГА: п. п. «г», «д», «е», 3 і 4 не пашыраюцца на асабозы і гандлёвыя пляцы.

4. Нагляд за выкананьнем гэтай абавязковай пастановы ўскладаецца на саннагляд і міліцыю.

5. Вінаватыя ў парушэньні гэтай абавязковай пастановы і далучаемых правіл падлягаюць адказнасьці ў адміністрацыйным парадку—штрафу да 100 руб., або прымусовым працам да 15 дзён, а прадпрыемствы могуць быць закрыты пастановай саннагляду.

Нам. старшыні Менскага Гарадзкога Савету **КАРАНЕЎСКІ.**

За сакратара Менскага Гарадзкога Савету **ЯГОЎДЗІК.**

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".

НОВЫ ГУКАВЫ МАСТАЦКІ кіно-роман ВЫТВОРЧАСЬЦІ БЕЛДЗЯРЖКІНО.

СЦЭНАРЫ В. Брадзянскага.

РЭЖ. В. Вайнштох.

АПЭР. А. Кальцаты.

СЕНЬНЯ І ШТОДЗЕННА

У ГАЛ. РОЛЯХ Барыс Шліхцінг, Соф'я МАГАРЫЛ, Алена ДЭЙНЭКО, Ул. ГАРДЗІН.

Засл. арт. РСФСР А. Н. Лаўрэнцьеў, В. Я. Сафронаў.

Шэдэўры кіно-артыст Георг Марціц.

СЛАВА СЬВЕТУ

ШТОДЗЕННА 4 СЭАНСЫ. ПАЧАТАК у 6, 7-30 9 і 10-30 КАСА—з 1 гадз. дня.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ на 4-месячныя падрыхтоўчыя КУРСЫ Ў ПЛЯНАВА-ЭКАНАМІЧНЫ ІНСТЫТУТ (ФАКУЛЬТЭТ НАРГАСВУЧОТУ) працягнут да 25 красавіка.

Стыпэндыя ад 30 да 60 руб. ў м-ц і кватэрныя 20 руб. у месяц.

Заявы прымаюцца ў канцылярыі ВОСУ (Менск, Камуністычная, 16, пакой № 10).

Беларуская Акадэмія Навук ДА ПЕРШАМАЙСКІХ СЬВЯТ ВЫХОДЗІЦЬ З ДРУКУ ЗБОРНІК навейшых матар'ялаў аб становішчы і рэвалюцыйнай барацьбе ў Заходняй Беларусі „ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ" ПРОДАЖ будзе ўтварацца ва ўсіх кнігарнях ДВВ, БАКТ'у і райспажыўсаюзаў.

Дзіцячы гукавы КІНО-ТЭАТР Касе з 12 г. дня. З 1 красавіка новы мастацкі фільм РАЗАМ з БАЦЬКАМІ

„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Каса—з 4 г. дня Замежны фільм Капітан ПЯТУЧАЙ ЧАРАПАХІ

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ" Замежная камэдыя ВОРАГ ЖАНЧЫН

„СПАРТАК" КАСА—з 2 г. 30 м. Мастацкі фільм Барацьба гігантаў драма ў 10 частках.

Рэктарат, МК, СНП і студэнты Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту выказваюць сваё шчырае спачуваньне прафэсару унівэрсытэту **М. Ф. Ермаленка** з прычыны сьмерці **яго БАЦЬКІ.**

Згубленыя і украдзеныя дакументы

лічыць несапраўднымі.

Парт. білеты: Наумава М. А., выд. Сіпельніканўскім РК КП(б)Б, Елісеева І. ф., выд. Менскім АК КП(б)Б за № 01296274, Пучы, ка Р. Ц., выд. Мен. ГК КП(б)Б за № 0817672, Романоўскага М. Я., выд. Магілёўск. РККП(б)Б. Германа П. К., выд. ЦК КП(б)Б за № 1624788, Аксёнава В. С., выд. Ленінградзкім абкомам УсеКП(б) за № 1739100, Чэрвонка І. І. выд. Мен. АК КП(б)Б, Бурэкова Ф. М., выд. ДПК-5 за № 2069545, Базьмен Г. С., выд. Мен. ГК КП(б)Б за № 1626482, Дземянчэнка М. С., выд. ДПК-7 за № 2022377, Давідовіч В. І., выд. Мен. ГК КП(б)Б за № 1624621, Нехайчык І. П., выд. Мен. Кастрычн. РК КП(б)Б, Маскеева В. Н., выд. Мен. ГК КП(б)Б за № 2405238, Любчына М. А., выд. Віцебскім ГК КП(б)Б за № 2427732, Каплан І. О., выд. Мен. ГК КП(б)Б за № 1620275, Толсьцік І. выд. Койдан. РК КП(б)Б за № 1621415, Беравюк І. Ф., выд. ДПК-6 за № 2531520, Рахлін Г. Д., выд. Гом. ГК КП(б)Б за № 1102550, Лушыц Я. І., выд. Бабр. РК КП(б)Б за № 1009103, Калодкін Д. Е., выд. ДПК-2 за № 2069695, Шахлевіч М. Я., выд. ДПК-2 за № 2535609, Шэршэнь Ф. Д. выд. Мен. ГК КП(б)Б за № 1627353, Шымановіч Р. Я., выд. Мен. ГК КП(б)Б, Царэўскі Б. А., выд. Магілёўск. РК КП(б)Б за № 1301026, Шапіра З. С., выд. Мен. ГК КП(б)Б за № 1296182, Максімчук А. А., выд. Мен. ГК. за № 1102952, Астрэйка С. В., выд. за № 2275448, Зэрэковіч З. П., выд. 2 ДПК за № 2536076, Барысевіч Н. І., выд. Мен. ГК за № 2726381, Красьнік Е. А., выд. Мен. ГК, Трушкевіч П. Ф., выд. Мен. ГК